Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

2 ЖНІЎНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 147 (30027)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

НЮАНСЫ СЕЛЬСКАЙ МЕДЫЦЫНЫ

КАЛІ ЎПЕРШЫНЮ ПРАГУЧАЛА ПЕРАБУДОВА? 13

КАРАТКА

- **Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь павіншаваў асабовы склад і ветэранаў сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл з прафесійным святам — Днём дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый, які адзначаецца сёння.**
- У Мінску пачалі будаваць другі ўчастак Зеленалужскай веткі метрапалітэна.
- **Беларусь павысіла экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты.**
- На ўборцы ўраджаю задзейнічаныя 355 маладых кіроўцаў.

ЛІЧБА ДНЯ

43,5 кг

другасных рэсурсаў кожны жыхар краіны ў сярэднім адсартаваў і здаў у перапрацоўку за першыя шэсць месяцаў бягучага года. У Беларусі за гэты перыяд нарыхтавана больш за 402 тысячы тон другасных матэрыяльных рэсурсаў, паведамілі ў Мінскай гарадской жыллёвай гаспадарцы. Больш чым жыхары іншых рэгіёнаў краіны, другасных рэсурсаў сабралі мінчане. Кожны жыхар сталіцы ў сярэднім перадаў для перапрацоўкі 48,6 кг ДМР. Другое месца — у жыхароў Гродзенскай вобласці (48,3 кг). На трэцім — Магілёўская вобласць (46,6 кг).

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Я НЕ ШКАДУЮ, ШТО Ў СВОЙ ЧАС УКЛАЛІ НЯМАЛА СРОДКАЎ У СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ. МЫ СЁННЯ АДЧУВАЕМ АДДАЧУ»

Рабочы тыдзень Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі прысвечаны сітуацыі ў рэгіёнах. Кіраўнік дзяржавы наведаў Брэсцкую вобласць. Камандзіроўкі на захад Беларусі ён анансаваў на мінулым тыдні. Па традыцыі падчас жніва Прэзідэнт асабіста кантралюе, як ідзе ўборка ўраджаю ў рэгіёнах, аблятаючы палі на верталёце і наведваючы сельскагаспадарчыя прадпрыемствы асабіста. У нядзелю кіраўнік дзяржавы правёў маніторынг палёў Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцей з вышыні. А ў аўторак наведаў ААТ «Белавежскі», што ў Камянецкім раёне.

Фота Бел ТА.

Без тэхналогій нікуды

Першае пытанне губернатару Юрыю Шулейку — пра ход уборачнай кампаніі. «Такое ўражанне, што палову ўжо сабраў», — заўважыў Прэзідэнт. «40 працэнтаў. Адзін пад адзін да ўзроўню мінулага года», — адказаў старшыня аблвыканкама.

У Брэсцкай вобласці амаль выйшлі на экватар уборачнай, ураджайнасць параўнальная з леташняй. Поспехі аграрыяў Брэсцкай вобласці паказваюць, што стаўкі на азімыя рапс і ячмень былі правільныя. «Харчовая, кармавая, грашовая культура», — такім чынам Прэзідэнт ахарактарызаваў азімы рапс. Ён пацікавіўся, ці перапрацоўваецца ўвесь рапс унутры краіны, ці не вывозіцца ў якасці сыравіны за мяжу. Яго запэўнілі, што ў гэтым плане ўсё адрэгулявана і ўсё ідзе на перапрацоўку. Добра сябе зарэкамендаваў у рэгіёне і азімы ячмень. «Мінулы год цудоўны. Будзем дабаўляць», — сказаў губернатар Брэсцкай вобласці Юрый Шулейка. Па яго словах, у рэгіёне сфарміравалася моцная матэрыяльна-тэхнічная база, на зароблены грошы закупляюць новыя камбайны, аднаўляюць старыя.

Кіраўнік дзяржавы падрабязна цікавіўся сітуацыяй на палях, планамі і перспектывамі на розныя сельскагаспадарчыя культуры, асаблівасцямі ранняй і агульнай уборкі ўраджаю. Галоўнае пытанне ад Прэзідэнта пры абмеркаванні ўборачнай кампаніі ва ўсёй краіне — «на што выйдзем сёлета». Як далажылі Прэзідэнту, у цэлым па краіне ёсць добрыя разлікі на ўраджай па многіх культурах, хоць у перыяд засухі і былі сумненні. Аднак па кукурузе чакаюць прыбаўку да ўзроўню мінулага года, таксама як і па цукровых бураках. У добрым стане і бульбяныя палі.

«Якая культура сёлета больш за ўсё насцярожвае?» — спытаў Прэзідэнт у віцэ-прэм'ера Леаніда Зайца. Той адказаў, што ў цэлым нічога не насцярожвае, тэхніка падрыхтаваная, людзі гатовыя працаваць.

СТАР. 2–3

Па сутнасці справы

СУСТРАКАЕМ II ГУЛЬНІ КРАІН СНД

Ці магчыма ахапіць спортам усю краіну? II Гульні краін СНД пакажуць і дакажуць, што гэта абсалютна магчыма. Упершыню ў гісторыі мультыспартыўны форум будуць прымаць усе рэгіёны. Кожны від спорту — спецыфічны, кожны горад — самабытны. 11 цікавых дуэтаў насычанай гарадской гісторыі і дынамічнай спартыўнай сучаснасці зробяць II Гульні краін СНД унікальнай і незабыўнай падзеяй. Да афіцыйнага адкрыцця застаецца тры дні. Спартсмены робяць апошнія падрыхтоўкі, каб дастойна прадставіць свае краіны, а іх чакаецца больш за 20. Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА заявіў, што забяспечана поўная гатоўнасць да II Гульняў краін СНД. Карэспандэнты «Звязды» даведаліся, як рэгіёны падрыхтаваліся да прыёму II Гульняў краін СНД і да ўпісання новай старонкі ў сваю гісторыю.

СТАР. 4–5

Калі вада — бяда

Што трэба ўлічыць, каб адпачынак на вадаёме не скончыўся трагедыяй

Практычна кожны дзень вада забірае чалавечыя жыцці. Трагедыі на вадаёмах фіксуюцца па ўсёй краіне. Сумная статыстыка папаўняецца новымі імёнамі. На жаль, дзіцячымі таксама. Паводле аператыўных даных, у перыяд з 1 чэрвеня да шасці раніцы 31 ліпеня 2023-га ў Беларусі зарэгістраваны 144 патанулыя. Сярод іх — дзевяць дзяцей...

Дзеці — пад пільнай увагай

28 ліпеня ў цэнтр аператыўнага кіравання Слаўгарадскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях паступіла паведамленне аб тым, што ў Слаўгарадзе патанула дзіця. Трагедыя адбылася ў штучным вадаёме. Ратавальнікі, якія аператыўна прыбылі на месца здарэння, дасталі з-пад вады дзіця без прыкмет жыцця. Спецыялісты адшукалі цела дзіцяці на адлегласці паўтара-два метры ад берага, на глыбіні каля двух метраў. Дзяўчынку 2015 года нараджэння даставілі на берег. Да прыбыцця хуткай медыцынскай дапамогі супрацоўнікі МНС праводзілі рэанімацыйныя мерапрыемствы, аднак выратаваць яе не ўдалося. Пасля ўрачамі хуткай медыцынскай дапамогі была канстатавана смерць дзіцяці.

СТАР. 6

«Я НЕ ШКАДУЮ, ШТО Ў СВОЙ ЧАС УКЛАЛІ НЯМАЛА СРОДКАЎ У СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ. МЫ СЁННЯ АДЧУВАЕМ АДДАЧУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Дзе ёсць тэхналогіі — пытанняў не ўзнікае», — адзначыў намеснік міністра сельскай гаспадаркі Уладзімір Гракун.

«Калі няма тэхналогіі, то і сеяць не трэба, чаго сеяць і атрымліваць 15-20 цэнтнераў з гектара. Мы больш працым, чым атрымліваем, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Калі людзі нармальна працуюць, тэхналагічна працуюць, дык такім людзям і дапамагаць можна».

Па словах кіраўніка дзяржавы, у Брэсцкай, Гродзенскай абласцях і частцы Мінскай праблем з тэхналогіямі няма. «Да гэтага трэба ісці, без тэхналогіі нікуды», — падкрэсліў ён.

Асобна, па словах Аляксандра Лукашэнкі, трэба звярнуць увагу на Віцебскую вобласць. На яго словах, па ўборцы гэты рэгіён трэба ўзнімаць. Кіраўнік дзяржавы настойвае на тым, каб, улічваючы кліматычныя асаблівасці, сеяць там больш ранніх культур — азімага рапсу, азімага ячменю і іншых. Такога ж падыходу варта прытрымлівацца ў паўночных раёнах Гродзенскай і Мінскай абласцей і Магілёўскай вобласці.

«Нам трэба высяваць такія ранніе культуры, каб пачынаць іх уборку ў сярэдзіне чэрвеня. Калі яны пачнуць уборку раней, яны раней і пасеюць. Ёсць разбежка паміж уборкай і сяўбой азімых культур, ёсць час. У Віцебскай вобласці гэтага часу няма. І на поўначы Гродзеншчыны, Міншчыны, і на Магілёўшчыне гэтага часу няма. Таму трэба раней пачынаць уборку. І іншыя культуры. Гэта жорсткае маё патрабаванне — пасеяць ранніе культуры ў паўночных раёнах, каб раней пачаць уборку. Вызвалім палі — раней засеем азімыя», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што ў жніўні-верасні ў аграрыяў будзе «запарка». Другі ўкос траў, корманарыхтоўка, уборка збожжавых культур, сіласаванне кукурузы хутка пачнуцца. І сянаж, і сілас, і ўборка збожжавых, і пасеў азімых — усё гэта адначасова. Як заўважыў Прэзідэнт, калі б усе працавалі так, як на полі пшаніцы ў «Белавежскім», то і пытанняў не было б. Зразумела, што не ва ўсіх гаспадарках працуюць адказна і рупліва. Але, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, да гэтага трэба імкнуцца. «Куча работы сабралася, усё гэта ў кучу ўпала, і надвор'е ўпала. Цяпер ні ў якім разе нельга расслабіцца. Цяпер трэба, наадварот, мабілізавацца», — сказаў Прэзідэнт.

Ад першага рэгіёна кіраўніку дзяржавы падарылі першы каравай з першага ўраджаю.

Аляксандр Лукашэнка ведае гісторыю ААТ «Белавежскі». Ён нагадаў, што падчас станаўлення гэтай гаспадаркі стаяла задача далучаць да яе землі іншых гаспадарак. Такая работа працягваецца і сёння. Аляксандр Дуньковіч, генеральны дырэктар ААТ «Белавежскі», падрабязна далажыў пра фінансава-гаспадарчую дзейнасць прадпрыемства. Яно ўвесь час прырастае тэрыторыямі за кошт суседніх гаспадарак. Гэта прыводзіць да росту рэнтабельнасці і эфектыўнасці на далучаных тэрыторыях. Аднак нават існуючых зямель не хапае, каб забяспечыць сябе кармамі для жывёлагадоўлі пад поўную патрэбу.

Насенне павінна быць айчынным

Падчас агляду рапсавага і пшанічнага палёў Аляксандр Лукашэнка даў адно з асноўных даручэнняў паездкі — шырока выкарыстоўваць айчыннае насенне замест імпартнага. Па словах кіраўніка дзяржавы, ён не супраць 15 працэнтаў насення імпартнай селекцыі, калі 80 працэнтаў будуць айчыннымі. «Гэта задача нумар адзін», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён зрабіў акцэнт на тым, што забяспечанасць уласным насеннем — гэта не толькі імпартазамяшчэнне, але і пытанне харчовай бяспекі.

Вельмі важна забяспечыць і якасць насення, праверыць, каб яно адпавядала высокім патрабаванням. Па словах кіраўніка дзяржавы, тады не прыйдзецца пераконваць кіраўнікоў гаспадарак выкарыстоўваць айчыннае насенне.

У ААТ «Белавежскі» Аляксандр Лукашэнка наведаў рабатызаваны малочнатаварны комплекс. Падчас нядаўніх рабочых паездак і селектарнай нарады па сельскай гаспадарцы ён даручаў вызначыць аптымальны варыянт пры будаўніцтве новых МТК і рэканструкцыі старых фермаў.

Сяляне — аснова краіны

Падчас наведвання ААТ «Белавежскі» Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з супрацоўнікамі прадпрыемства і жыхарамі аднайменнага пасёлка. Сустрэча з працоўнымі калектывамі даўно стала традыцыяй наведванняў прадпрыемстваў. Як пажартаваў Прэзідэнт, ён сам настойвае, каб людзі кожную хвіліну праводзілі на рабочым месцы. А цяпер сам адарваў іх ад спраў.

«Наогул, вы, вядома, малайцы. Я рэдка, заўважаю за сабой, хвалю людзей, але вы малайцы. Дзякуй вам вялікі за тую работу. Сяляне ўвогуле ў нас людзі моцныя. Не таму, што я сам з сялян і хвалю вас. Але вы моцныя людзі і на вас трымаецца краіна. І нават у тыя цяжкія часы ніводны з вас не вагаўся і не зварухнуўся. Усе былі ў полі, кармілі і тых, хто карыстаўся вынікам працы сялян, і тых, хто размахваў па Мінску ў асноўным рукамі. Вы — аснова нашай краіны. І я ніколькі не шкадую аб тым, што ў свой час прымалі праграмы па адраджэнні вёскі і ўклалі нямала сродкаў у сельскую гаспадарку. Мы сёння адчуваем аддачу. Мы не толькі накармілі свой народ, але і прыстойна летась на сем з лішнім мільёнаў долараў прадалі прадуктаў харчавання. Я часта сустракаюся з Прэзідэнтам Расіі, мы абмяркоўваем гэтыя пытанні, сінхранізуем работу... Як адчувалі, што нам гэтыя «сябры» з Захаду могуць падкінуць праблем. Сёння і Беларусь, і Расія сябе забяспечваюць прадуктамі харчавання. Нашы людзі адзетыя, як у Расіі, так і ў Беларусі. Накормленыя, адзетыя, абутыя — а гэта галоўнае. Калі гэтага няма, ніколі не будзе стабільнасці ў краіне. А адзенне, абутак і харчаванне — гэта вы, сяляне. І дай бог, каб у нас усе такія гаспадаркі былі па краіне, працавалі рэнтабельна. Такім і дапамагчы не шкада», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт растлумачыў, чаму прыехаў у «Белавежскі». Па яго словах, яму было цікава паглядзець, як на захадзе ў нас людзі працуюць. «Нядрэнна працуюць», — заўважыў ён.

«Малайцы, Брэсцкая вобласць цяпер выйшла на добры ўзровень. Ёсць яшчэ над чым працаваць. Юрый Вітольдавіч гэта бачыць і разумее. Ёсць яшчэ і ў Гродне над чым працаваць. Адчуваецца, што Брэсцкая і Гродзенская вобласць добра выглядаюць», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, сёлета ў розных рэгіёнах заўважная розніца ва ўмовах надвор'я. У сувязі з гэтым аграрыяў чакае вельмі шмат работы. Трэба будзе нарыхтоўваць кармы, і ўборка яшчэ не скончана, а хутка трэба будзе пачынаць сеяць азімыя. «Расслабляцца ні ў якім разе нельга», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён расказаў, што навука плённа працуе над тым, каб у краіне было як мага больш айчыннага насення. Прэзідэнт заўважыў, што ў «Белавежскім» наладжана добрая работа з арганічнымі ўгнаеннямі, спецыялісты ўносяць іх пад зімовы палетак. Па яго словах, некаторым гаспадаркам у дадзеным напрамку яшчэ трэба працаваць.

«Вось так па крупінках, наведваючы раёны і гаспадаркі, я збіраю перспектыўныя напрамкі на развіццё нашай вёскі. База ў нас добрая, ёсць на чым засноўваць нашы будучыні поспехі. Народ мы накормім, і самі будзем сытыя, адзетыя і абутыя. І дзеткі нашы будуць нармальна хадзіць у школу, што сёння вельмі актуальна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. На яго словах, ні адна краіна ў свеце не мае такога сацыяльнага пакета, як Беларусь. «Я часам думаю, што мы нейкі год можам не вытрымаць гэтай падтрымкі. Але гэта не страшна. Самае галоўнае, каб людзі разумелі, што гэта і іхнія дзеці. Формулу я ўвёў калісьці: «Першае і другое — гэта вашы дзеці, трэцяе, чацвёртае і пятае — мае». Таму шматдзетныя сем'і мы будзем падтрымліваць. Самая вялікая праблема для нас ужо не эканамічная, хоць гэта ўжо ўсе эканомікі, а дэмаграфічная. Нам трэба больш насельніцтва», — сказаў ён.

«Я не хачу, каб мой народ ваяваў»

Прэзідэнт падкрэсліў, што час цяпер няпросты. Аднак нагадаў, што беларусы — мірныя людзі, якія наваяваліся за сваю гісторыю. «Як гісторык, я гэта добра ведаю, ведаю, што хапіла тут, не толькі Брэсцкая крэпасць да смерці стаяла, а колькі людзі пацярпелі ў тую страшную вайну... У кожнай сям'і загінулі людзі. Таму я не хачу, каб мой народ, асабліва пры мне, ваяваў. Вы бачыце, што адбываецца ў нашых суседзяў. Не чужыя людзі. Гэта страшная рэч. Робім высновы, урокі для нас вельмі сур'ёзныя. Але я хачу, каб вы разумелі: мы зброяй не браззгаем. Але рыхтуемся ў любы момант абараніць сваю краіну», — сказаў ён.

Пры гэтым, як звярнуў увагу Прэзідэнт, Беларусь разлічвае на дапамогу сваіх сяброў на ўсходзе — Расійскую Федэрацыю. Паводле яго слоў, расійскае кіраўніцтва адгукаецца нават на самыя сур'ёзныя просьбы беларускага боку, у прыватнасці, аб размяшчэнні ў Беларусі тактычнай ядзернай зброі.

«Ядзерная зброя — гэта бяспека. На ядзерную краіну яшчэ ніхто ніколі не нападаў. У нас атамная станцыя, гэта, я вам павінен сказаць, вельмі моцны фактар бяспекі: калі рване, крый божа, мала не падасца, і там у тым ліку. З гэтай справай трэба быць вельмі асцярожнымі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, тактычная ядзерная зброя, больш за палову якой ужо завезена ў Беларусь, разгрупавана па ўсёй краіне, — гэта фактар нашай бяспекі. «Не дай бог давядзецца выкарыстоўваць гэтую зброю. Я спадзяюся, што такога не будзе. Усе павінны разумець: вы да нас не лезьце, — сказаў Прэзідэнт. — Мы ні да каго ў агарод не лезем, і да нас, калі ласка, не лезьце. Мы забяспечым сваю бяспеку з дапамогай нашых сяброў», — падкрэсліў ён.

«Кожны на сваім месцы рабіце сваю справу»

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што цяпер ходзіць шмат размоў і чутак вакол прыватнай ваеннай кампаніі «Вагнер».

«Калі былі тыя непрыемныя падзеі, мне прыйшлося ўмешвацца. Бо я разумеў: калі ўспыхне Расія, горача будзе ўсім. Так заўсёды было ў гісторыі: рэвалюцыі пачыналіся там, а заканчваліся ў нас і на Каўказе. І потым, гэта ж нашы людзі. І я папярэджу тады гэтым хлопцам: «Калі вы спыніцеся, бяспеку я вам гарантую, мы вас выведзем у Беларусь, далей будзем разбірацца». Што мы цяпер і робім», — нагадаў ён, як развівалася сітуацыя з ПВК «Вагнер».

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што яму хацелася б захаваць гэтае падраздзяленне ў Беларусі. «Гэта сапраўдныя байцы, якія прайшлі праз вайну, страцілі сваіх сяброў, яны цалкам бясплатна (а яны ж наёмнікі, усюды за грошы ваявалі і працавалі) дапамагаюць нам і перадаюць вопыт», — падкрэсліў ён. «Вось нядаўна чую: ашалела Польшча, што нібы сюды ідзе нейкі атрад ажно сто чалавек. Ніякія атрады ПВК «Вагнер» сюды не перамяшчаліся, а калі і перамяшчаліся, то толькі для таго, каб перадаць досвед брыгадам, якія сканцэнтраваныя ў Брэсце і Гродне. Я павінен вучыць сваіх вайскоўцаў, таму што армія, якая не ваюе, — гэта напалову армія, вы таксама тое выдатна разумееце. Ваяваць я не хачу. Я не хачу, каб гінулі нашыя хлопцы. Таму трэба іх вучыць. Вось яны і перадаюць свой досвед. Параяць, нешта падкажуць. Вельмі задаволены нашымі ваеннымі. Кажуць, гэта вельмі падрыхтаваныя людзі, а самае галоўнае — яны хочуць вучыцца. Таму, знаходзячыся пад Асіповічамі, у цэнтры Беларусі, гэтыя хлопцы нікуды не імкнуцца. Яны прывыклі выконваць загад», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, нейкія падраздзяленні ПВК «Вагнер» перайшлі ў расійскую рэгулярную армію, нехта працуе ў Афрыцы, паўночная частка застанецца ў Беларусі. «Гэта была мая ініцыятыва, і я не шкадую. Я хачу пакінуць гэтых хлопцаў ва Узброеных Сілах нашай краіны. І, адштурхоўваючыся ад іх, больш актыўна ствараць кантрактнае войска. У нас жа тэрміновая служба: прызыў — адслужыў паўтара года — сышоў. Сам быў такі. Зялёныя хлопцы, 18 гадоў. А там надзеленыя вопытам людзі, там у асноўным афіцэры, гэта іх прафесія — ваяваць або абараняць краіну. Кажуць, гэта і танней. Таму мы прыглядаемся да такога вопыту, каб у будучыні сябе абараніць. Толькі ў гэтым наша мэта», — расказаў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што Беларусь не імкнецца да вайны. І ўсё будзе нармальна. «Калі праціўнік будзе бачыць, што мы адкажам і што яны панясуць незаменныя страты, непрымальныя для іх, яны ніколі не нападуць. Гэта азбука ваеннай справы», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён нагадаў пра сваю пастаянную параду кожнаму беларусу: у кожнага ёсць свая справа — бухгалтар, механізатар, аператар машыннага даення. «Кожны на сваім месцы рабіце сваю работу. Дысцыпліна, парадак», — заклікаў Прэзідэнт.

«Мы трапілі ў вялікі міжнародны замес»

Зразумела, што ў сённяшніх абставінах людзей хвалююць пытанні бяспекі, яны цікавяцца пытаннямі геапалітыкі. Хто лепш за Прэзідэнта можа даць адказы на некаторыя пытанні па згаданых тэмах? Жыхары аграгарадка Белавежскі, які размяшчаецца на прыгранічных тэрыторыях, прызналіся, што іх насцярожваюць дзеянні польскіх уладаў на граніцы з Беларуссю, а таксама сцягванне да яе іх войскаў і ўзбраенняў.

Аляксандр Лукашэнка адказаў, што бачыць, як польскія вайскоўцы перакідваюць сюды з дзвюх дывізій па батальёне. «Я не думаю, што яны спрабуюць нас запалохаць. Я не думаю, што яны баяцца нас. Я не думаю, што яны гэта робяць у сувязі са зменай становішча. Там таксама не ідыёты. Яны бачаць, што мы не праводзім ніякіх мабілізацыйных мерапрыемстваў, што мы не сцягваем сюды войскі, на Захад», — сказаў ён. Прэзідэнт нагадаў, што ў 2020 годзе да заходніх рубяжоў Беларусі сцягваліся войскі, таму што тады сітуацыя ўнутры Беларусі была больш напружанай, чым цяпер. Паводле яго слоў, існуе шмат прычын, чаму цяпер так развіваецца сітуацыя.

«Мы трапілі ў вялікі міжнародны замес. Уся Еўропа. Амерыканцы з часоў Трампа разбураюць Еўропу. Трэба на кагосьці стаўку рабіць, яны ж за тысячу кіламетраў. Памятаеце выхад Англіі з Еўрасаюза? Што было дрэнна для Англіі? Усё было нармальна. Але Англія і Злучаныя Штаты Амерыкі — гэта сябры не разлі вада. Іх адносіны павязаныя-перавязаныя больш, чым у нас з Расійскай Федэрацыяй. Таму Вялікабрытанія — гэта іх апора, непатапляльны авіяносец. З іншага боку — Польшча. Робяць стаўку на Польшчу. На нас і на Украіну павінны былі. Калі б у 2020 годзе не вытрымалі, нас бы ў кучу, і гэты пояс ад Балтыкі да Чорнага мора (Польшча, Беларусь і Украіна) — санітарны кардон паміж Расіяй і Кітаем на ўсходзе. Выстаялі. Вось яны сёння стаўку робяць на Польшчу», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт пажартаваў, што «вагнераўцы» паміж сабой перагаворваюцца: маўляў, на экскурсію ў Жэшуў сходзім. Гэта звязана з тым, што тэхніка і ўзбраенні ішлі з Жэшува туды, дзе пад Арцёмаўскам (Бахмутам) ваявалі «вагнераўцы». Паводле слоў Прэзідэнта, там загінулі многія іх таварышы, і яны ім гэтага не даруюць.

«Няхай яшчэ скажуць беларусам і мне дзякуй за

тое, што мы запрасілі да сябе гэтых байцоў. А гэта не адна тысяча. Я нават не хачу называць. Усяго сёння ў іх пад кантролем больш за 30 тысяч чалавек. Гэта хлопцы, зараджаныя на вайну, пакрыўджаныя. Шмат скалечаных, загінулых. Яны, што, даруюць? Не даруюць. Таму няхай моляцца, што мы трымаем іх, яшчэ неяк забяспечваем. У адваротным выпадку яны без нас трапілі б туды і ўламалі б так гэтаму Жэшуву і Варшаве, што мала б не падалося. Таму мяне папракаць не трэба, а няхай скажуць дзякуй», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, Польшча яшчэ падкіне Беларусі праблем. «Не палякі — яны разумныя людзі, а кіраўніцтва. Мы бачылі, калі мігранты перасякалі граніцу туды, як паводзілі сябе вайскоўцы. Яны не разумелі: навошта нас сюды кідаюць? Але з глузду з'ехалі кіраўнікі. Амерыканцы будуць рабіць стаўку на іх».

Беларускі лідар заўважыў, што кіраўніцтва ЗША часцей бывае ў Варшаве і Вільнюсе, чым у іншых сталіцах Еўропы, краіны якой аказаліся ў цісках НАТА. «Гэта значыць, падцягваюць гэтыя краіны, каб абаперціся на іх у рэгіёне. А Старая Еўропа, Францыя апынуліся ў цісках», — падкрэсліў ён. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, Еўропа для ЗША не вораг, але моцны сапернік. Гэта высокатэхналагічныя краіны, моцныя, багатыя. «Вось яны цяпер распранаюць Еўропу: давайце грошы. Яшчэ, памятаеце, з часоў Трампа: 2 % ад ВУП на ўзбраенне, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — У цісках Еўропа. Трэба ім разабрацца з Еўропай. Яны ўжо прынізілі гэтую Еўропу далей няма куды», — сказаў ён. У якасці прыкладу прывёў Германію, чацвёртую эканоміку свету, якая за два гады скацілася на 10-11-е месца.

Прэзідэнт растлумачыў, што ЗША патрэбныя прыніжаная і растаптаная Еўропа, знішчаная Расія і свабодны выхад да Кітая. «Таму перакідка гэтых войскаў — гэта «мышкаванне». 500 чалавек там перакінулі, 500 чалавек тут. Ідзе запалохванне і нагнятанне. Хоць я не веру, што яны спрабуюць нас запалохаць. Тое, што нас запалохаць немагчыма, я вам абяцаю», — падсумаваў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што да гэтага трэба ставіцца спакойна.

Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што «вагнераўцы» плануюць заняць Сувалкскі калідор (сухапутны калідор уздоўж граніц Польшчы і Літвы, які мог бы злучыць тэрыторыю Беларусі з Калінінградскай вобласцю Расіі).

«Сувалкскі калідор не ў Беларусі. Мы па ім не перамяшчаемся. Галоўнае, каб было спакойна. Ён нам тысячу гадоў не патрэбен. Але гэта наша зямля. І калі мы вырашым перамясціць сваіх вайскоўцаў, мы перамесцім», — адзначыў ён. Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь самастойна выбудоўвае сваю абарону.

«Пераціскаць не трэба людзей»

Адна з жыхарак аграгарадка адзначыла, што нядаўна ў Беларусі ўступіў у сілу закон аб грамадзянстве, які абавязваў грамадзян паведамляць, калі ў іх ёсць замежнае грамадзянства. У дакументе прапісаныя нормы, на падставе якіх могуць пазбавіць беларускага грамадзянства. «А як быць з картай паляка? Можа быць, яе трэба ўвогуле па-за законам пакінуць і неяк абмежаваць людзей, у якіх ёсць гэтая карта паляка?» — задалі пытанне кіраўніку дзяржавы.

«З аднаго боку, вы перажываеце, што хтосьці можа пазбавіць грамадзянства. А з другога боку, трэба націскаць так, каб гэтых з картай паляка...» — заўважыў беларускі лідар.

Грамадзянства можна пазбавіць толькі тых, хто, жывучы тут ці недзе яшчэ, змагаецца супраць нашай краіны. «Мы з вамі хапілі гора з гэтым у свой час. Толькі ў тым праблема. І ў гэтым плане мы яшчэ практычна нікога не пазбавілі грамадзянства. Але папераджальна яны павінны разумець, што калі вы нашыя ворагі і змагаецеся супраць нашай краіны там, да санкцый заклікаеце (гэтыя «лахушкі» і іншыя «ціхушкі»), дык што з вамі ваджадцца. Толькі гэта маецца на ўвазе», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што людзям, у якіх ёсць карта паляка, добра падрэзалі крылы. Але, паводле слоў Прэзідэнта, ён адчувае, што тут праблема ёсць. І да яе яшчэ вернуцца. Ён даручыў прапрацаваць дадзенае пытанне ў Адміністрацыі Прэзідэнта і паглядзець, якія наступныя крокі рабіць у згаданым кірунку. «Не хочацца пакрыўдзіць людзей», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што ёсць шмат людзей, якія зрабілі карту паляка па прынцыпе «ўсе бралі — і я ўзяў», думаючы аб тым, што яна можа даць нейкія перавагі пры паездцы за граніцу. І калі трэба будзе вярнуць карту паляка — гэтыя людзі яе вернуць.

«Пераціскаць не трэба людзей. Людзі павінны жыць свабодна на сваёй зямлі, у сваім грамадстве. Каб яны выказвалі пазіцыю сваю, нікога не баяліся. У адваротным выпадку навошта такая дзяржава, дзе будуць ціснуць людзей. Таму вельмі важна не перагнуць палку. Гэта не я прыдумаў. Гэта народны выраз. Але пра гэтых падумаем», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Выпускніца Белавежскай сярэдняй школы падзялілася сваімі ўражаннямі ад экскурсіі ў Палац Незалежнасці. Гэтую экскурсію дзяўчына назвала «найлепшай у сваім жыцці». Ад імя сваіх землякоў яна падарыла кіраўніку дзяржавы пано са знакамі Камянецкага раёна і Брэсцкай вобласці. «Спадзяюся, што яно зойме дастойнае месца ў Палацы Незалежнасці», — сказала яна. «Намёк зразумеў», — адказаў Прэзідэнт, абяцаючы, што ў Палацы Незалежнасці падарунку знойдзецца месца.

«Жывіце мірна, дружна, гадуйце сваіх дзяцей. Пажадана патрыятычных. І тады ніхто нас не разгайдае і ўсё ў нас будзе добра. Здароўя вам», — пажадаў Прэзідэнт. Увазе кіраўніка дзяржавы прапанавалі і прадукцыю прадпрыемстваў Камянецкага раёна.

Валерыя СЦЯЦКО,
Камянецкі раён.

УНІКНУЦЬ ВА ЎСЕ ПЫТАННІ

Памочніка Прэзідэнта прадставілі на Віцебшчыне

Ігара БРЫЛО ў якасці памочніка Прэзідэнта — інспектара па Віцебскай вобласці прадставіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА, які падкрэсліў, што таму на новай пасадзе трэба будзе глыбей азнаёміцца з сітуацыяй у вобласці, паведамляе БелТА.

Фота БелТА.

***

«Упэўнены, што Ігар Вячаслававіч з годнасцю будзе выконваць пастаўленыя перад ім задачы, тым больш ён даволі добра паглыблены ў тыя працэсы, якія адбываюцца ў Віцебскай вобласці, я маю на ўвазе ў першую чаргу пытанні развіцця сельскай гаспадаркі. Ён ведае кадры, раёны, яшчэ больш уважліва і глыбока ўнікне ў тое, што адбываецца, у тым ліку ў скрытыя працэсы, якія негатыўна ўплываюць на развіццё вобласці. Назначаючы Ігара Брыло на пасаду інспектара па Віцебскай вобласці, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што неабходна рэгіён узнімаць на больш высокі ўзровень. Гэта датычыцца ўсіх пытанняў — сацыяльна-эканамічнага блока, бяспекі, кадраў, каб рэгіён па шэрагу паказчыкаў перамясціўся з апошніх пазіцый у краіне і выйшаў ды заняў сваё дастойнае месца», — падкрэсліў Ігар Сергеенка.

Таксама ён абазначыў важныя стратэгічныя моманты ў рабоце памочніка Прэзідэнта. Гэта распрацоўка па адным інвестпраекце на кожны раён, павелічэнне выпуску прадукцыі перапрацоўчых прадпрыемстваў, развіццё Аршанскага раёна, які знаходзіцца пад пільнай увагай кіраўніка дзяржавы, а таксама развіццё малых населеных пунктаў па прынцыпе вёскі будучыні — з развітой інфраструктурай і перспектывамі для прадпрыемстваў. Адным з важных кірункаў у рабоце інспектара па Віцебскай вобласці таксама павінна стаць сфера адукацыі з узмацненнем у ёй ідэалагічнага складніка, у тым ліку сярод педагагічных работнікаў.

Таксама ў Віцебску Ігар Сергеенка абмеркаваў з педагогамі адукацыйныя пытанні: вынікі ўступнай кампаніі ў арганізацыйным плане, ці трэба вяртаць вусны іспыт, у якія дні лепш праводзіць ЦЭ.

Найперш кіраўніка Адміністрацыі цікавіла пытанне, як настаўнікі паставіліся да новаўвядзення сёлетняй выпускной кампаніі, а менавіта да правядзення цэнтралізаванага экзамену (ЦЭ). У цэлым педагогі адзначылі, што такая сістэма значна разгрузіла выпускнікоў школ і дазволіла засяродзіцца на мэтанакіраванай падрыхтоўцы да сумешчаных экзаменаў. Таксама ўзрасла і матываванасць дзяцей у выбары канкрэтнай прафесіі.

У ліку прапаноў па ўдасканаленні сістэмы выпускных іспытаў віцебскія настаўнікі прапанавалі праводзіць ЦЭ з разбежкай не на тыдзень, а ў 2-3 дні і ў будні. Школьныя настаўнікі, якія сёлета на траціну складалі камісіі на ЦЭ, былі вымушаныя працаваць без выхадных на працягу ўсіх экзаменаў. У той жа час **начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага аблвыканкама Дзмітрый ХОМА** расказаў, што ў гарадах, дзе такія выпрабаванні праводзіліся ў ВНУ, арганізаваць ЦЭ ў будні будзе праблематычна, таму што там таксама ідзе свой навучальны працэс. Ігар Сергеенка адзначыў, што дадзенае пытанне трэба разгледзець дэталёва і паспрабаваць знайсці прымальнае рашэнне.

Што датычыцца вяртання вусных экзаменаў, аб якіх гаварыў кіраўнік дзяржавы на адным з пасяджэнняў, то педагогі лічаць мэтазгодным правядзіць іх як мінімум па замежных мовах, таму што потым у ВНУ першакурснікі, якія рыхтаваліся да тэставых заданняў, сутыкаюцца з праблемай актыўнага маўлення. Да таго ж пры дыялогу з абітурыентам бачны ўзровень яго падрыхтоўкі і камунікатыўныя навыкі. У адносінах да ЦЭ настаўнікі выказваліся станоўча з пункту гледжання яго бесстароннасці і аб'ектыўнасці ацэнкі.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта таксама пацікавіўся, як ідзе мэтавая падрыхтоўка ў школах Віцебскай вобласці, наколькі хлопчыкі і дзяўчынкі з педагагічных, агракласаў матываваныя да паступлення ў ВНУ па абранай спецыялізацыі. Дзмітрый Хома расказаў, што ў большасці выпадкаў навучэнцы такіх спецыялізаваных класаў накіраваныя на паступленне па профілі. Таксама ён нагадаў, што маладым спецыялістам — заатэхнікам і ветурачам — аблвыканкам даплачвае Br1000 да зарплаты. Кіраўнік упраўлення падкрэсліў, што гэта мера падтрымкі дзеля ўмацавання прэстыжу аграрных прафесій. Аднак у вобласці спецыялістаў дадзенага профілю пакуль больш не стала.

Вучні, якія ідуць у 10-я класы ў Віцебскай вобласці, складаюць палову ад тых, хто выпускаўся з 9-га класа. Як правіла, падлеткі з невысокім сярэднім балам пасведчання аб базавай адукацыі выбіраюць установы сярэдняй спецыяльнай і прафэсадукацыі. Астатнія ў школах, як паведаміў Дзмітрый Хома, у асноўным арыентаваныя на паступленне ў ВНУ.

Таксама ў аўдыторыі абмеркавалі пытанні здачы асобных прадметаў пасля 9-га і 11-га класаў. Педагогі выказаліся, напрыклад, наконт гісторыі Беларусі. Дзевяцікласнікі, якія паступаюць у ССНУ, будуць здаваць там іспыт па гэтым прадмеце, і для іх ён усё роўна застанецца сярод важных і ў каледжы. Выпускнікі сярэдняй школы, на думку настаўнікаў, павінны ў якасці абавязковай здаваць гісторыю Беларусі, бо потым у ВНУ ў іх будзе толькі заліковы курс, а пры здачы экзаменаў яны падыходзяць да падрыхтоўкі больш сур'ёзна і лепш ведаюць гісторыю роднай краіны, што з'яўляецца важным элементам патрыятычнага выхавання.

Ігар Сергеенка адзначыў, што спектр узнятых віцебскімі педагогамі пытанняў вельмі шырокі і дае магчымасць уявіць сітуацыю ў сферы адукацыі ў паўночным рэгіёне.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У М'янме яшчэ на паўгода працягнулі надзвычайны рэжым

Улады М'янмы ў чарговы раз працягнулі надзвычайнае становішча на шэсць месяцаў на фоне ўзброеных сутыкненняў у краіне. Аб гэтым са спасылкай на тэлеканал Myawaddy TV паведаміла ТАСС. Адпаведнае рашэнне было аднагалосна прынята Саветам нацыянальнай абароны і бяспекі. Рэжым надзвычайнага здарэння, які дзейнічае ў краіне з лютага 2021 года, працягваўся сёлета ў лютым. Ваенныя М'янмы зрушылі грамадзянскі ўрад 1 лютага 2021 года на падставе артыкула канстытуцыі, паводле якога армія з'яўляецца яе асноўным гарантам. Тады сілавікі заявілі аб маштабных фальсіфікацыях на карысць Нацыянальнай лігі за дэмакратыю на парламенцкіх выбарах у лістападзе 2020-га.

Цэны на какава-бабы пабілі 12-гадовы рэкорд

Кошт нью-ёркскіх ф'ючарсаў на какаву дасягнуў 3,5 тысячы долараў за тону. Апошні раз ён дасягаў такога высокага ўзроўню ў 2011 годзе. Як адзначаюць эксперты, скачок цэн звязаны з надвор'ем у Заходняй Афрыцы, адкуль ажыццяўляюцца асноўныя пастаўкі какава-бабоў на сусветны рынак. Цяпер у рэгіёне ідуць праліўныя дажджы, якія ствараюць праблемы на плантацыях. Паведамляецца, што ўраджай бабоў у Кот-д'Івуары сёлета ўпадзе на 20 працэнтаў, а ў Гане ён будзе ніжэйшы за гістарычны сярэдні паказчык. Вытворцы шакаладу Lindt & Sprungli AG і Hershey Co. ужо папярэдзілі аб далейшым росце цэн, а таксама аб магчымым пагаршэнні якасці прадукцыі і памяншэнні памераў шакаладных плітак. У найбліжэйшай перспектыве наўрад ці варта чакаць зніжэння цэн, адзначае Bloomberg. Агенцтва прагназуе, што высокі кошт сыравіны для вытворчасці шакаладу захаваецца да 2024 года. Цяжкасці адзначаюцца ў тым ліку ў апрацоўшчыкаў сыравіны: у прыватнасці, прыкметна скарацілася перапрацоўка какава-бабоў у Вялікабрытаніі.

Талібы спальваюць музычныя інструменты і апаратуру

Прадстаўнікі руху «Талібан» спалілі музычныя інструменты і апаратуру коштам у тысячы долараў, сцвярджаючы, што музыка вядзе да маральнага раскладання. Гітары, клавішныя, народныя перкусійныя інструменты, узмацняльнікі і калонкі — усё гэта рэлігійная паліцыя талібаў у правінцыі Герат знішчыла ў мінулыя выхадныя на вялізным вогнішчы. Многае з таго было канфіскавана ў месцах правядзення вяселляў. Як сказаў кіраўнік рэгіянальнага аддзялення Міністэрства прапаганды дабрадзейнасці і прадухілення заганы шэйх Азіз Рахман Мухаджыр, музыка «накіроўвае моладзь у лжывым кірунку і вядзе да разбурэння грамадства», паведаміла дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва «Бахтар».

II ИГРЫ СТРАН СНГ БЕЛАРУСЬ 2023

СТАЛІЦА ЦАЛКАМ ГАТОВАЯ

Урачыстыя цырымоніі адкрыцця і закрыцця II Гульняў краін СНД пройдуць 5 і 13 жніўня на «Мінск-Арэне». Аб падрыхтоўцы да іх правядзення на аператыўнай нарадзе ў мэрыі распавёў начальнік галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Максім ВАРАПАЙ.

Для правядзення гульняў па сямі відах спорту ў Мінску задзейнічаюць дзесяць аб'ектаў. За Мінгарвыканкамам як саарганізатарам гульняў замацавана правядзенне спаборніцтваў па трох відах спорту: баскетболе 3х3, мастацкай гімнастыцы і пляжным футболе.

«Для забеспячэння паспяховай падрыхтоўкі да правядзення Гульняў СНД Міністэрствам спорту і турызму створаны аператыўна-каардынацыйны штаб на базе БДУФК. Распараджэннем старшыні Мінгарвыканкама створаны таксама аператыўны штаб па правядзенні гульняў на тэрыторыі Мінска», — расказаў Максім Варапай.

Спаборніцтвы па баскетболе 3х3 пройдуць з 11 да 12 жніўня ў «Палова-Арэне» і Палацы спорту. У турніры возьмуць удзел па дзесяць мужчынскіх і жаночых камандаў.

Спаборніцтвы па мастацкай гімнастыцы ў рамках гульняў пройдуць з 4 да 6 жніўня на базе Палаца мастацкай гімнастыкі. У гэтым відзе спорту за ўзнагароды будзе змагацца амаль 70 спартсменак з 10 камандаў. Як заўважыў Максім Варапай, спартыўная інфраструктура цалкам гатовая да правядзення спаборніцтваў. Дэлегацыі размесяцца ў гасцініцы «Вікторыя».

Тэрміны правядзення гульняў па пляжным футболе вызначаны ў перыяд з 5 да 9 жніўня. Сапернікі сустрэнуцца на базе спартыўна-аздараўленчага комплексу «Алімпійскі». «Стадыён па пляжным футболе і трэніровачнае поле да спаборніцтваў гатовыя», — пракаментаваў Максім Варапай.

Усе спартыўныя дэлегацыі прыбываюць на Гульні праз Нацыянальны аэрапорт, дзе размясціўся пункт акрэдытацыі для ўдзельнікаў. Першыя зборныя каманды ўжо прыехалі ў Беларусь.

На ўсіх спартыўных аб'ектах, вызначаных для спаборніцтваў, прадугледжаны медыцынскія пункты, а таксама пакоі допінг-кантролю. За фізічным станам спартсменаў у спаборніцкай і разміначнай зонах будуць сачыць медыкі. Для аказання медыцынскай дапамогі плануецца задзейнічаць брыгады хуткай дапамогі: па дзве брыгады на кожны спартыўны аб'ект у дні правядзення спаборніцтваў.

У Міністэрства спорту і турызму прадстаўлены звесткі аб тураператарах, адказных за прыём замежных турыстаў у Мінску на час Гульняў, якія падрыхтавалі турыстычныя пакеты ад 1 да 8 дзён з пераздамі па розных гарадах. Падрыхтавана серыя відэароліка ў-прэзентацый гарадоў правядзення II Гульняў краін СНД.

КУП «Сталічны транспарт і сувязь» распрацавала і ўзгадніла ва ўстаноўленым парадку схемы часовых аўтобусных маршрутаў, якія абслугоўваюць удзельнікаў Гульняў.

Супрацоўнікамі сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі праведзены абследаванні спартаб'ектаў правядзення Гульняў, месцаў пражывання ўдзельнікаў і часовых аўтобусных маршрутаў. Вызначаны таксама месцы паркоўкі аўто на спартыўных аб'ектах.

Арганізацыя культурна-масавай праграмы для ўдзельнікаў Гульняў і турыстаў запланавана ў рамках летняга музычна-турыстычнага сезона ў сталіцы. Дадзенае пытанне курыруе ўпраўленне культуры Мінгарвыканкама.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота БелТА.

МІНШЧЫНА — МОЦНЫ ХАРАКТАР І ПЛЯЖНАЯ ГАРАЧЫНЯ

Мінская вобласць — яшчэ адзін рэгіён, у якім спаборніцтвы прымуць два гарады. Салігорск на дзесяць дзён са сталіцы шахцёраў ператворыцца ў сталіцу барцоў. На пляцоўцы тэніснага манежа «Шахцёр» разгорнуцца спаборніцтвы па трох відах барацьбы — вольнай, грэка-рымскай і жаночай. Усяго ў Салігорск прыедуць пяцьсот спартсменаў больш як з дзесяці краін. Спаборніцтвы па барацьбе абяцаюць быць самымі прадстаўнічымі ў праграме II Гульняў краін СНД. Барацьбу ў гэтым горадзе шануюць, тут ужо праходзілі чэмпіянат краіны па вольнай барацьбе, першынство Беларусі па грэка-рымскай барацьбе сярод юніёраў і першынство краіны па вольнай барацьбе сярод дзяўчат. «Нас актыўна падтрымлівае кіраўніцтва горада і кіраўніцтва «Беларуськалія», за што ім вялікі дзякуй. Тыя ўмовы, якія ёсць у Салігорску, даюць магчымасць праводзіць спаборніцтвы па барацьбе на высокім узроўні. І я ўпэўнены, што турнір у рамках II Гульняў краін СНД не стане выключэннем», — упэўнены **Алім СЕЛІМАЎ, старшыня Беларускай федэрацыі барацьбы.**

Для гасцей, якія ў Салігорску плануюць атрымаць асалоду не толькі ад спаборніцтваў, але і ад самога горада, расчыняць свае дзверы Салігорскі краязнаўчы музей і Музей працоўнай славы ААТ «Беларуськалій», раённы Цэнтр рамёстваў, размешчаны ў гарадскім пасёлку Старобін. Запланаваны і шэраг майстар-класаў: па барацьбе ад знакамітых спартсменаў і па вырабе народных лялек і абярэгаў ад мясцовых майстроў.

Маладзечна стане сталіцай пляжнага валейбола, у раённым цэнтры пабудаваны адзін з найлепшых у краіне стадыёнаў для гэтага віду спорту. Яго магчымасці дазваляюць праводзіць адначасова некалькі матчаў. Побач з асноўнымі кортамі — яшчэ чатыры пляцоўкі, на якіх пройдуць папярэднія спаборніцтвы II Гульняў краін СНД. Трыбуны могуць змясціць 1,2 тысячы гледачоў. Стадыён знаходзіцца ў вельмі выгаднымі месцы — у самым цэнтры горада. Акружае яго парк Перамогі. Спаборніцтвы па пляжным валейболе сярод мужчынскіх і жаночых камандаў пройдуць у Маладзечне з 4 да 8 жніўня. У першы дзень пройдуць афіцыйныя трэніроўкі, а з 5 жніўня — папярэднія гульні, паўфіналы і фіналы.

ВІЦЕБШЧЫНА — ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ВІДЫ І НАВАТАРСКІЯ ПАДЫХОДЫ

Замест артыстаў — спартсмены, а ў грымёрках — раздзявалкі. Першае ў сваёй гісторыі спартыўнае мерапрыемства рыхтуецца прыняць Летні амфітэатр у Віцебску. У рамках II Гульняў краін СНД сэрца міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар» стане сэрцам тайландскага бокса.

«Усё выдатна падрыхтавана, арэна ў выдатным стане. Сцэнарны план цырымоніі адкрыцця і ўзнагароджання пераможцаў — усё да дробязяў прадумана. Вельмі ўдзячны віцяблянам, якія займаліся падрыхтоўкай, і федэрацыі тайскага бокса, усім арганізатарам. Я думаю, тут будзе адна з найлепшых арэн у краіне на гэтых спаборніцтвах», — адзначаў **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК** падчас наведвання тэставых спаборніцтваў па тайскім боксе ў Віцебску.

Намеснік начальніка ўпраўлення спорту і турызму Віцебскага аблвыканкама Дзяніс ШКІР'ЯНАЎ падкрэслівае, што задача арганізатараў — не проста правесці спаборніцтвы па тайскім боксе, а зрабіць з іх сапраўднае шоу. Лепшую пляцоўку для выканання гэтай задачы, чым Летні амфітэатр, прыдумаць цяжка: тут і гукавыя, і светлавыя магчымасці, і, вядома, досвед спецыялістаў Цэнтра культуры «Віцебск». Каб шоу было паўнацэнным, вырашальныя паядынкі будуць праводзіцца вечарам з адпаведным гукавым і светлавым суправаджэннем.

На пляцоўках каля амфітэатра разгорнецца разміначная зона, каб кожнаму спартсмену было зручна рыхтавацца да выступлення. Недалёка будзе разгорнута і фан-зона. Па словах Дзяніса Шкір'янава, арганізатары чакаюць на трыбунах мноства маладых людзей, бо задача абласнога ўпраўлення спорту і турызму — прыцягнуць да тайландскага бокса як мага больш аматараў. А лепшай рэкламы віду спорту, чым яркае спартыўнае відовішча, напэўна, няма.

Віцебскі рэгіён не абмяжоўваецца толькі тайландскім боксам. Орша прымае спаборніцтвы па боксе. Наогул спаборніцтвы па боксе ў паўночным рэгіёне — своеасаблівы падарунак да 35-годдзя залатога алімпійскага медаля Вячаслава Яноўскага, ураджэнца Віцебскай вобласці. Тут раней шанавалі бокс, паважаюць яго і сёння. «У Оршы створана добрая школа бокса, напрацавана нядрэнная практыка. У аддзяленні бокса Аршанскай гарадской спецыялізаванай дзіцячаюнацкай школы алімпійскага рэзерву займаецца 108 дзяцей. Больш юных баксёраў трэніруецца толькі ў Віцебскай гарадской СДЮШАР», — расказвае Дзяніс Шкір'янаў.

У Віцебску спаборніцтвы пачынаюцца 9 жніўня, 8-га прыязджаюць спартсмены. «У Оршы мы чакаем больш за 180 гасцей. У Віцебску з улікам, напэўна, спецыфікі віду спорту — каля 120 чалавек», — падкрэсліў Дзяніс Шкір'янаў. Усе госці, якія маюць акрэдытацыю II Гульняў краін СНД, змогуць бясплатна наведаць культурныя аб'екты Віцебска і Оршы.

Валерыя СЦЯЦКО.

Брэст: зоны гасціннасці і фестываль марожанага

Варта нагадаць, што талісман II Гульняў краін СНД родам з Белавежскай пушчы. Яшчэ Брэстчына дала форуму два сучасныя аб'екты. Адзін з іх — палац спорту «Вікторыя».

Гэта ўнікальны спартыўны комплекс з арыгінальнай архітэктурай. Тут трэніруюцца прадстаўнікі трох алімпійскіх відаў спорту. У палацы праходзяць чэмпіянаты і Кубкі краіны, адбываліся Балтыйскія юнацкія гульні, міжнародныя турніры па міні-футболе і мноства іншых спартыўных і культурных мерапрыемстваў. На арэне «Віктарыі» праз некалькі дзён сустрэнуцца наймацнейшыя гандбалісты краін Садружнасці сярод юнакоў і дзяўчат.

Другой спартыўнай пляцоўкай у горадзе над Бугам абраны Брэсцкі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па водных відах спорту. Тут выявяць наймацнейшых у плаванні. Паводле інфармацыі кіраўніцтва цэнтра, да новых рэкордаў у водным палацы цалкам гатовыя. Дарэчы, нацыянальныя рэкорды на доўгай вадзе — у 50 метраў — апошнія дзесяць гадоў фіксавалі менавіта тут. Сістэма электроннага хронаметражу функцыянуе згодна з міжнароднымі стандартамі.

— У поўнай гатоўнасці чатыры чашы басейнаў, гэта больш за 7500 кубаметраў вады, якая праходзіць некалькі этапаў ачысткі штодня. У распараджэнне спартсменаў будзе адведзена інфраструктура для трэніровак — дадатковы басейн, трэнажорная і гульнявая зала, — паведаміла **дырэктар Брэсцкага абласнога Цэнтра алімпійскага рэзерву па водных відах спорту Вольга СЦЁПУСЬ.**

Побач з комплексам «Вікторыя» і Палацам водных відаў спорту ўстановяць вялікія экраны для трансляцый. Тут жа разгорнуцца зоны гасціннасці, будзе арганізавана работа гандлёвых пунктаў, на дапамогу замежным гасцям прыйдуць валанцёры з веданнем замежных моў. Прадугледжана забаўляльная праграма для дзяцей.

Вялікая ўвага аддаецца культурнай праграме, найперш яе турыстычнаму складніку. Гасцям прапануюць экскурсію «Брэст гістарычны і сучасны», прагулку па вячэрнім горадзе, маршрут «Брэст спартыўны», пешую экскурсію па вуліцы Савецкай «Брэст запальвае агні». Госці змогуць пабываць у Брэсцкай крэпасці, паехаць у Белавежскую пушчу, наведаць палацавы комплекс у Ружанах і палацава-паркавы комплекс Пуслоўскіх у Косаве Івацэвіцкага раёна. У спісе прапаноў — заалагічны парк у Баранавіцкім раёне «Дыпрыз», адзіны ў краіне музей касманаўтыкі ў Тамашоўцы, музей народнай творчасці «Бездзежскі фартушок». Удзельнікі спартыўнага свята змогуць далучыцца да фэстаў, якія даўно сталі візітоўкай рэгіёна: экалагічнага фестывалю «Спораўскія сенакосы» ў Бярозаўскім раёне 12 жніўня, «Мотальскіх прысмакаў» у Іванаўскім раёне 12—13 жніўня, гастраэкалагічнага фестывалю «Палескі ўюн» у Пінскім раёне 5 жніўня.

Да адкрыцця Гульняў у Брэсце прымеркавалі яшчэ адно мерапрыемства — свята марожанага. Яно адбудзецца ў дзень адкрыцця форуму, 5 жніўня, на набярэжнай Мухаўца. **Начальнік упраўлення спорту і турызму Брэстаблвыканкама Юрый ХОМІЧ** паведаміў, што ў маляўнічай зоне над ракой установяць вялікі экран, на якім у прамым эфіры будзе трансліравацца цырымонія адкрыцця з «Мінск-Арэны». А вытворцы Брэстчыны тым часам зладзяць відовішчныя і смачныя прэзентацыі розных відаў марожанага.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Гуллівая Рыся запрашае ў Гомель і Жлобін

У арганізацыйным плане падрыхтоўка да правядзення спаборніцтваў і самой сустрэчы ўдзельнікаў II Гульняў краін СНД — беспрэцэдэнтная падзея для Гомельшчыны.

Ужо з 2 жніўня чакаецца заезд у абласны цэнтр камандаў краін-удзельніц, судзейскага складу і балельшчыкаў у абласны цэнтр. Размяшчацца госці будуць у гасцініцах «Турыст» і «Амакс» у цэнтры Гомеля. Так што ў гамяльчан з'явіцца выдатная магчымасць убачыць дэлегацыі, пажадаць спартсменам перамогі.

Галоўная пляцоўка II Гульняў краін СНД у Гомелі — Лядовы палац спорту. Пятага жніўня тут будзе дадзены старт спаборніцтвам па дзюдо. За адкрыццём спаборніцтваў можна будзе сачыць з фан-зоны. У анлайн-фармаце будзе арганізавана дэманстрацыя цырымоніі адкрыцця і закрыцця Гульняў, а таксама ходу ўсіх спаборніцтваў.

Акрамя таго, усіх жадаючых каля гомельскага Лядовага палаца спорту сустрэнуць розныя спартыўныя лакацыі, фотазоны, гандлёвыя рады. Пройдуць культурна-забаўляльныя праграмы і конкурсы.

Другой сталіцай II Гульняў краін СНД на Гомельшчыне стане Жлобін. Спаборніцтвы па самба пройдуць у Палацы гульнявых відаў спорту Цэнтра алімпійскага рэзерву Жлобіна. Папярэднія і фінальныя сустрэчы самбістаў на гэтай спартыўнай арэне чакаюцца 12 жніўня.

— На сёння пацверджаны ўдзел у будучых стартах каля 350 чалавек — прадстаўнікоў спартыўных дэлегацый. У цэлым з судзейскім апаратам Гомельскі рэгіён прыме каля 500 чалавек, — паведаміў падчас правядзення сходу аргкамітэта па падрыхтоўцы да II Гульняў краін СНД **начальнік упраўлення спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама Павел СТАРАСВЕЦКІ.**

Асаблівы акцэнт у рэгіёне — на забеспячэнне харчавання для спартсменаў. Меню ўзгоднена з Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтрам спорту. Будзе забяспечана адпаведнае харчаванне для спартсменаў ісламскага веравызнання. Таксама па жаданні гасцей і спартсменаў пасля спаборніцтваў можна будзе адведаць беларускую нацыянальную кухню.

— Усе службы занятыя для таго, каб спаборніцтвы прайшлі ў добрай атмасферы, каб якасна падрыхтаваць не толькі спартыўную інфраструктуру, але і гарадскую, якая знаходзіцца побач. Ужо можна ўбачыць, як змяніліся аб'екты ў Гомелі і Жлобіне, — адзначыў начальнік упраўлення спорту і турызму аблвыканкама.

Дастаўляць да месцаў правядзення спаборніцтваў спартсменаў

Прадукцыя з брэндам II Гульняў краін СНД ад прадпрыемстваў Гомельшчыны будзе рэалізоўвацца па ўсёй краіне.

на Гомельшчыне будуць 17 брэндзіраваных аўтобусаў. У абласным цэнтры ўжо курсіруе грамадскі транспарт з лагатыпам II Гульняў краін СНД.

Высокую гатоўнасць праваахоўнікаў Гомельшчыны забяспечыць неабходны ўзровень бяспекі ў месцах правядзення II Гульняў краін СНД, адзначыў **першы намеснік начальніка УУС аблвыканкама Анатоль ВАСІЛЬЕЎ.**

Так, у Гомелі і Жлобіне прайшлі спецыяльныя тактычныя заняткі па забеспячэнні аховы грамадскага парадку для супрацоўнікаў падраздзяленняў, якія будуць працаваць непасрэдна на аб'ектах. Праваахоўнікі адпрацавалі алгарытм дзеянняў пры ўзнікненні надзвычайных сітуацый, групавых парушэнняў грамадскага парадку. Былі прапрацаваныя таксама метады выкарыстання прафайлінгу пры ацэнцы людзей, прагназаванні паводзін чалавека з дапамогай даных аб знешнасці, вербальных і невербальных паводзін.

Усе зацікаўленыя службы і ведамствы ацанілі асартымент і якасць прадукцыі з сімволікай II Гульняў краін СНД, якую падрыхтавалі прадпрыемствы Гомельшчыны. Прэзентацыя брэндзіраванага транспарту, адзення і сувеніраў прайшла ў гомельскім Лядовым палацы спорту.

Брэндзіраваную прадукцыю з сімволікай II Гульняў краін СНД выпусцілі чатыры прадпрыемствы Гомельшчыны — фабрыкі «Спартак» і «8 Сакавіка», «Рэчыцкі тэкстыль», Добрушскі фарфоравы завод.

— Мы ганарымся тым, што права выпуску сувенірнай прадукцыі падчас правядзення II Гульняў краін СНД атрымалі прадпрыемствы Гомельскага рэгіёна. Гэтая прадукцыя будзе рэалізоўвацца не толькі ў нашай вобласці, але і па ўсёй краіне, — звярнуў увагу падчас прэзентацыі брэндзіраванай прадукцыі **начальнік упраўлення спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама Павел СТАРАСВЕЦКІ.**

Ён звярнуў увагу, што на Гомельшчыне распрацаваны турыстычны пакет для знаёмства ўдзельнікаў з тураб'ектамі рэгіёна. У гарадах правядзення Гульняў створаны турпакеты з уключэннем для бясплатнага наведвання афіцыйных дэлегацый Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, абласнога музея ваеннай славы, мемарыяльнага комплексу ў Красным Беразе, Жлобінскага краязнаўчага музея.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

Магілёў чакае лучнікаў і каратыстаў

Першыя ўдзельнікі II Гульняў краін СНД прыбудуць у Магілёў 2 жніўня. Да іх сустрэчы ў горадзе на Дняпры ўсё гатова. Яшчэ 24 ліпеня старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА асабіста праінспектаваў пляцоўкі будучых спаборніцтваў — стадыён «Спартак» і спарткомплекс «Алімпіец», а таксама гасцініцу «Магілёў», якая ў гэтыя жнівеньскія дні прымае ўдзельнікаў і гасцей маштабнага спартыўнага мерапрыемства. Губернатар застаўся задаволены і адзначыў, што падрыхтоўка праведзена якасна.

Магілёў сустракае ўдзельнікаў II Гульняў краін СНД адпаведнымі банерамі і расцяжкамі з выявай спартыўнай рысі. У горадзе пройдуць спаборніцтвы па стральбе з лука і па каратэ.

— Падрыхтоўка да Гульняў вялася практычна паўгода, — расказаў **начальнік упраўлення спорту і турызму Магілёўскага аблвыканкама Сяргей НОВІКАЎ**. — На аб'ектах, якія прымаюць удзельнікаў, праведзены ўсе неабходныя работы. Мы паклапаціліся пра тое, каб і спартсменам, і гледачам было камфортна і зручна.

Спаборніцтвы па стральбе з лука на стадыёне «Спартак» пройдуць упершыню. Тут устанавілі новае табло, зрабілі рамонт у раздзявальнях, замянілі сядзенні на спартыўнай арэне.

Магілёў быў абраны для гэтага віду спорту невыпадкова. Горад славіцца добрай школай лучнікаў. Першыя энтузіясты з'явіліся тут у пачатку 1970-х, а ў 1980-х метадам народнай будоўлі была пабудавана спецыялізаваная база стральбы з лука. Хутка аддзяленне па стральбе з лука было адкрытае ў Магілёўскім вучылішчы алімпійскага рэзерву. Сярод выхаванцаў магілёўскай спартыўнай школы лучнікаў такія зоркі, як Алена Марфель, Ганна Марусава, Антон Прылепаў, Карына Дзёмінская. У II Гульнях краін СНД бярэ ўдзел шмат магіляўчан. Наогул у Магілёў прыязджае каля ста чалавек з ліку спартсменаў, трэнераў, суддзяў і медперсаналу. У спаборніцтвах будуць задзейнічаныя прадстаўнікі дзевяці краін, у тым ліку Расіі, Азербайджана, Арменіі, Кыргызстана, Пакістана і іншых. Каб ператварыць спаборніцтвы ў вялікае свята для балельшчыкаў, недалёка ад стадыёна створана месца для фан-зоны.

10 жніўня Магілёў развітаецца з лучнікамі і будзе сустракаць спартсменаў па каратэ. Да іх паядынкаў падрыхтаваны сучасны і прасторны спарткомплекс «Алімпіец». Тут таксама праведзены рамонт і набытыя ўсе неабходныя рэчы для суправаджэння спаборніцтваў. Для відовішнасці баталій закуплены сучаснае табло і 40 метраў LED-панэляў. Удзел у спаборніцтвах возьме каля 250 чалавек.

Ну а адпачыць перад паядынкамі, а заадно падмацаваць свае сілы гульцы змогуць у гасцініцы «Магілёў». Тут таксама ўсё ўжо гатовае для іх камфортнага размяшчэння.

— Пачатак спаборніцтваў будзе азнаменаваны ўрачыстай цырымоніяй прывітання, — падкрэсліў Сяргей Новікаў. — Кожная каманда зможа выйсці пад сваім сцягам, павітаць арганізатараў, сапернікаў і балельшчыкаў. Для стварэння святочнага настрою пройдуць невялікія канцэртныя выступленні. Гэты момант прапрацаваны з установамі культуры горада. Мы прыклалі максімум намаганняў для таго, каб у спартсменаў была магчымасць раскрыцца на поўную сілу, а гасцям і турыстам было цікава ў Магілёве.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Экзамен для Гродзенскага рэгіёна

Падрыхтоўка да Гульняў з'яўляецца сапраўдным экзаменам для арганізацый, прадпрыемстваў, рэгіянальных тэрыторый Гродзенскага рэгіёна. Разам з тым мерапрыемства дае магчымасць ацаніць не толькі стан спорту і тых аб'ектаў, якія задзейнічаныя падчас II Гульняў краін СНД, але і атмасферу прыёму замежных гасцей.

У Гродне такога маштабу гульні пройдуць упершыню. У аблвыканкаме аддаецца значная ўвага спартыўнаму форуму, вядзецца пастаянны маніторынг сітуацыі. Гродна, як і іншыя гарады-ўдзельнікі, гатовы паспрачацца за высокі рэйтынг правядзення спартыўных гульняў.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца стану спартыўнага комплексу «Нёман», дзе адбудуцца спаборніцтвы па хакеі на траве і цяжкай атлетыцы. Як адзначалася падчас прыёмкі аб'ектаў, стан пляцовак адпавядае міжнародным стандартам, прымяняюцца перадавыя інфармацыйныя тэхналогіі, падрыхтаваныя зоны для тэлетрансляцыі і работы журналістаў. Звернута ўвага на бяспеку падчас масавых мерапрыемстваў і медыцынскае забеспячэнне.

Арганізатары імкнуцца да таго, каб згаданая падзея стала не толькі спартыўнай, але і відовішчнай, пакінула добры след у гараджан і ўдзельнікаў Гульняў.

— Важна дастойна сустрэць гасцей. Горад ужо набыў урачысты выгляд, прадугледжана 20 білбордаў, задзейнічаны святлодыёдныя экраны, на ўездзе гасцей будзе сустракаць роставая фігура рысі — талісман II Гульняў краін СНД, — паведаміў **начальнік упраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама Максім МАЛАХОЎСКІ.**

У Гродне чакаюць крыху больш за 200 чалавек па цяжкай атлетыцы — спартсменаў, трэнераў, урачоў, суддзяў. Спаборніцтвы пройдуць у Лядовым палацы, дзе на гэты час арэна будзе ператворана ў атлетычны памост. Што датычыцца хакея на траве, заяўлена пяць камандаў сярод жанчын і шэсць камандаў мужчын, агульная колькасць каля 150 чалавек. Пляцоўка для згаданага віду таксама падрыхтавана.

Для гараджан будзе створана фан-зона на Савецкай плошчы ў Гродне з вялікім вэб-экранам і фуд-кортам. Тут усе жадаючыя змогуць убачыць трансляцыю спаборніцтваў, урачыстае адкрыццё і закрыццё Гульняў. Таксама будуць працаваць творчыя калектывы, спартыўныя каментатары, чакаюцца конкурсы і прызы. Для камандаў і спартсменаў распрацаваны турыстычныя экскурсіі і маршруты, а ўсе акрэдытаваныя ўдзельнікі спартыўнага форуму змогуць наведаць знакавыя аб'екты горада бясплатна. Дарэчы, і на самі спаборніцтвы ўваход таксама бясплатны. Чакаецца, што ўсе трыбуны будуць запоўненыя. Ужо цяпер у гасцініцах складана забраніраваць месцы на даты правядзення спаборніцтваў. Таму разглядаюцца альтэрнатыўныя варыянты: турыстычныя базы, хостэлы, здымныя кватэры.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

У тэму

Ігар ГЕДЗІЧ, сенатар ад Гродзенскай вобласці, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:

— Цікавасць да такой падзеі вельмі высокая. Відавочна, што гродзенцы і турысты будуць імкнуцца наведаць спартыўныя спаборніцтвы з удзелам вядомых спартсменаў, а таксама жаночай каманды па хакеі на траве «Рытм», якая з'яўляецца адной з самых тытулаваных камандаў Беларусі. Будзе магчымасць убачыць выступленне многіх моцных камандаў і спартсменаў краін СНД, а таксама спартсменаў Кубы, Венесуэлы, В'етнама і іншых краін.

Не застануцца расчараванымі нашы госці і турыстычным патэнцыялам рэгіёна. Будуць арганізаваны тэатралізаваныя экскурсіі па гістарычным цэнтры Гродна, у тым ліку на замежных мовах. Іх будуць праводзіць студэнты-валанцёры ГрДУ імя Янкі Купалы. Даволі шмат канцэртаў, выставак, вандровак. Горад гатовы прадставіць увесь спектр свайго мастацтва як у залах, так і на адкрытых сцэнічных пляцоўках. Да II Гульняў прыстасавана маштабнае свята на Аўгустоўскім канале, у праграме якога балотны футбол і заплыў «На чым папала». Удзельнікі спартыўных дэлегацый змогуць таксама наведаць палацава-паркавы комплекс «Свяцк», які нядаўна пачаў прымаць наведвальнікаў пасля маштабнай рэканструкцыі.

Увогуле хачу дадаць, што такога ўзроўню спаборніцтвы станоўча ўплываюць на спартыўны і турыстычны імідж краіны. Лічу, што спорт варта як мага больш папулярызаваць, уцягваць у яго дзяцей і моладзь, бо толькі такім чынам можна разлічваць на ўмацаванне як фізічнага, так і духоўнага здароўя.

Сацыяльны ракурс

МАЛАДЫЯ ПРОФІ, НА СТАРТ...

Больш як 53 тысячы маладых спецыялістаў прыйдзе ў жніўні ў арганізацыі і на прадпрыемствы краіны на сваё першае працоўнае месца. Сярод тых, хто быў размеркаваны, каля 16,7 тысячы выпускнікоў ВНУ, 18 тысяч спецыялістаў і рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй і 18,8 тысячы рабочых або служачых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй.

Большасць «навабранцаў» прыступае да работы па размеркаванні 1 жніўня, а 15 жніўня ў навучальныя ўстановы прыйдуць і маладыя педагогі.

Як ставіцца да размеркавання — як да абавязку або як да сацыяльнай гарантыі — кожны сам вырашае для сябе. Але ў яго ёсць відавочныя плюсы. Размеркаванне не проста гарантуе выпускніку, які яшчэ не мае практычнага досведу, першае працоўнае месца. Малады спецыяліст у дадзеным выпадку падстрахаваны з усіх бакоў. Па-першае, наймальнік абавязаны даць яму работу па той спецыяльнасці і той кваліфікацыі, якая ўказана ў яго дыпломе і занатавана ў накіраванні. Але самая галоўная прывілея — абарона ад звальнення на працягу работы па размеркаванні. **Наймальнік не мае права ўстанаўліваць маладым спецыялістам выпрабавальны тэрмін і не можа звольніць маладога спецыяліста на аснове такой фармулёўкі, як «неадпаведнасць займаемай пасадзе ці выконваемай рабоце з прычыны недастатковай кваліфікацыі».**

У месячны тэрмін з дня заключэння працоўнага дагавора наймальнік павінен выплаціць маладому спецыялісту грашовую дапамогу, так званыя пад'ёмныя ў памеры месячнай стыпендыі, прызначанай студэнту ў апошнім перад выпускам семестры. Калі ён яе не атрымліваў, выплата разлічваецца, зыходзячы з памераў сацыяльнай стыпендыі, якая была актуальная на дату выпуску. Маладому спецыялісту, накіраванаму для работы ў якасці педработніка, грашовая дапамога выплачваецца за 45 каляндарных дзён.

Работнік, які размеркаваўся не па месцы пастаяннага пражывання, атрымае яшчэ і аднаразовую дапамогу ў памеры аклада. Месца жыхарства работніка пацвярджаецца адзнакай аб рэгістрацыі ў пашпарце.

Таксама ўстанаўліваюцца стымулюючыя выплаты выпускнікам, якія прыбылі на работу ў бюджэтныя арганізацыі, падпарадкаваныя міністэрствам адукацыі і культуры, у памеры ад 20 да 45 працэнтаў аклада, Міністэрству спорту і турызму — ад 10 да 50 працэнтаў. У сістэме Міністэрства аховы здароўя такія выплаты складаюць ад 20 да 50 працэнтаў ад аклада, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны — 10 працэнтаў.

У раёнах радыеактыўнага забруджвання ў асобных сферах (адукацыя, ахова здароўя, сельская гаспадарка, культура) ажыццяўляецца аднаразовая выплата ў памеры 200 базавых велічынь (7400 рублёў) пры заключэнні першага кантракта тэрмінам на пяць гадоў, а таксама выплачваецца аднаразовая дапамога ад 555 рублёў да 2775 рублёў.

Таксама па Указе Прэзідэнта № 353 за два першыя гады абавязковай адпрацоўкі спецыялісты сельгаспрадпрыемстваў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй атрымліваюць даплату ў памеры 0,46 базавай стаўкі, а ў наступныя тры гады — 0,69 базавай стаўкі.

Новаспечаным спецыялістам трэба мець на ўвазе, што многія моманты аказання дапамогі маладым кадрам прадугледжаныя ў калектыўных дагаворах. Напрыклад, калі малады спецыяліст жыве ў іншым населеным пункце, ён можа скарыстацца кампенсацыяй праезду да месца свайго размеркавання. Калі застаецца працаваць па заканчэнні абавязковага тэрміну, яму выплачваецца дадатковая матэрыяльная дапамога.

Яшчэ адзін важны момант. Работнік лічыцца маладым спецыялістам на працягу ўсяго перыяду работы па размеркаванні: спецыялісты з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй — два гады, з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй — год. Калі спецыяліст паступіў у магістратуру на платнай аснове, ён не губляе свой статус і павінен адпрацаваць пасля вучобы належныя гады або пакрыць затрачаныя на яго навучанне дзяржаўныя сродкі. Пры гэтым магістрант-бюджэтнік зноў павінен быць размеркаваны. Тыя, хто навучаўся на II ступені вышэйшай адукацыі, адпрацоўваюць год, а тыя, хто паступіў на другую ступень у год заканчэння першай ступені, — два гады. Калі выпускнік прыходзіць на работу па мэтавым накіраванні, то тэрміны адпрацоўкі могуць быць рознымі: пасля ўніверсітэта — не менш за пяць гадоў, пасля каледжа — не менш за тры.

А вось абавязак забяспечваць маладога спецыяліста жыллём нідзе на заканадаўчым узроўні не прапісаны. Адзіная гарантыя ў дадзенай сферы, замацаваная на дзяржаўным узроўні, — права маладога спецыяліста, які прыбыў па месцы размеркавання, прымацца на ўлік асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, без дадатковых патрабаванняў па неабходным тэрміне пражывання ў адпаведным населеным пункце, у тым ліку ў Мінску і Мінскім раёне.

Рашэнне маладога спецыяліста застацца і далей працаваць па месцы размеркавання пасля двухгадовага тэрміну залежыць выключна ад зацікаўленасці наймальніка і ад створаных для жыцця і прафесійнага росту маладога спецыяліста ўмоў. Натуральна, на месцах усе разумеюць, што без жылля замацаваць кадры, асабліва ў сельскай мясцовасці, немагчыма, таму размяшчаюць у інтэрнатах, даюць службовае жыллё, дапамагаюць будаваць сваё. Наймальнік у індывідуальным парадку разглядае пытанне аб вызначэнні памеру выплат на арэнду жылля, аб парадку і ўмовах кампенсацыі арэнды.

Выпускнікам устаноў адукацыі трэба мець на ўвазе, што адмовіцца ад размеркавання і атрымаць свабодны дыплом можна толькі ў выключных выпадках. Уважлівай прычынай лічыцца паступленне на больш высокі ўзровень адукацыі, напрыклад у магістратуру або для выпускніка каледжа — на ўзровень вышэйшай адукацыі першай ступені. Таксама гэта служба ў войску, пытанні, звязаныя з непрацаздольнасцю і здароўем.

Калі малады спецыяліст не прыбыў да месца размеркавання ў тэрмін, наймальнік павінен на працягу 15 дзён паведаміць аб гэтым ва ўстанову адукацыі. Не з'явіцца можна толькі з уважлівай прычыны і пры наяўнасці дакумента, які яе пацвярджае, напрыклад бальнічнага ліста. У такім выпадку трэба пісьмова праінфармаваць пра гэта ўстанову адукацыі і наймальніка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Калі вада — бяда

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Абставіны трагедыі ўдалося высветліць праваахоўным органам. Пяцёра дзяцей гулялі на беразе штучнага вадаёма. Васьмігадовая дзяўчынка вырашыла памачыць ногі, спусцілася ў ваду, змачыла крыху адзенне і вярнулася на бераг. Раздзеўшыся на беразе, яна зноў пайшла ў ваду. У вадаёме яна паслізнулася і стала тануць. Хлопчык, з якім гуляла пацярпелая, спусціўся ў ваду і спрабаваў ёй дапамагчы — не атрымалася. Дапамога спатрэбілася ўжо яму: каб ён выбраўся на бераг, іншая дзяўчынка падала сябру палку. Ужо будучы на сушы, дзеці пабеглі да бацькоў і расказалі пра здарэнне. Пра тое, што адбылося, бацькі дзяўчынкі даведаліся ад суседзяў. Паводле інфармацыі следчых, папярэдне ўстаноўлена, што дзеці знаходзіліся каля вады без догляду дарослых. Вадаём не быў прызначаны для купання.

17 ліпеня трагедыя здарылася ў Магілёўскім раёне. З супрацоўнікамі цэнтра аператыўнага кіравання Чавускага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях звязалася жанчына, якая паведаміла аб тым, што ў Магілёўскім раёне на беразе возера знайшлі рэчы яе сына 2015 года нараджэння, а яго месцазнаходжанне невядомае. Ратавальнікі, якія прыбылі да месца выкліку, на паверхні вады нікога не ўбачылі. На беразе вадаёма яны знайшлі дзіцячыя рэчы. Пазней вадалазы МНС з-пад вады выцягнулі хлопчыка без прыкмет жыцця. Супрацоўнікі медыцынскай дапамогі канстатавалі смерць дзіцяці. Яго цела знаходзілася за тры метры ад берага, на глыбіні каля паўтара метра.

Як удалося ўстанавіць, загінулы купаўся ў возеры разам са стрыечным братам. Дарослых побач з імі таксама не было. Калі адзін з хлопчыкаў сышоў пад ваду, яго брат прыбег дадому ў мокрым адзенні і расказаў пра тое, што здарылася, сваім бацькам. Менавіта яны і паведамілі аб гэтым маці патанулага дзіцяці, якая пабегла на возера, знайшла рэчы сына, а затым патэлефанавала ў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Практычна ўсе трагічныя выпадкі падобныя адзін да аднаго. І, напэўна, многіх з іх можна было б пазбегнуць, каб побач з дзецьмі на вадаёме былі бацькі ці іншыя дарослыя, хто за іх адказвае. Дарослы чалавек у стане аб'ектыўна ацаніць абстаноўку і здольны аператыўна зрэагаваць на сітуацыю. Пускаць непаўналетніх, а тым больш зусім малых дзяцей, адных да вадаёма — вельмі рызыкоўна.

— Бацькі, памятайце: дзеці ні ў якім разе не павінны знаходзіцца каля вады без вашага нагляду — гэта галоўнае правіла, якога вы абавязаныя няўхільна прытрымлівацца, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ.** — Зрабіце ўсё, каб зберагчы сваё дзіця ад непрыемнасцяў, паспрабуйце арганізаваць яму адпачынак максімальна бяспечна і будзьце заўсёды побач. Не злоўжывайце спіртнымі напоямі, калі адпачываеце разам з дзецьмі каля вадаёма. Не брыце дзяцей на возера або рэчку ў начны час. І вельмі важны момант — навучыце сваіх дзяцей плаваць, каб у іх былі элементарныя навыкі паводзін на вадзе.

Як звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ,** для малых дзяцей небяспеку складаюць і басейн, і нават невялікая ёмістасць з вадой. Аб гэтым сведчыць няшчасны выпадак, які ў пачатку лета адбыўся ў Мінскім раёне. Дзяўчынка, якой не было і двух гадоў, патанула ў зборным басейне, глыбіня якога была меншая за метр. Як высветлілася, пакуль бацькі дзіцяці працавалі на ўчастку свайго прыватнага дома, дзяўчынка самастойна гуляла па двары без нагляду. Бацькі знайшлі яе ўжо без прыкмет жыцця.

Купацца ў дазволеным месцы і не рызыкаваць

Сярод ахвяр вады — і дарослыя людзі. Апошнія трагічныя выпадкі сведчаць аб тым, што не ўсе разумеюць небяспеку, якую нясе вада. Асабліва рызыкуюць тыя, хто купаецца ў стане алкагольнага ап'янення. Як правіла, менавіта такія з кожным днём папаўняюць сумную статыстыку. Яшчэ адзін вельмі важны момант — для купання неабходна выбіраць толькі спецыяльна адведзеныя для гэтага месцы. Многіх трагедый можна было б пазбегнуць і тады, калі б людзі ўзважана ацэньвалі свае сілы: не плылі на далёкую адлегласць, не ныралі ў ваду з вышыні.

У Брэсцкім раёне відавочцы і супрацоўнікі МНС выратавалі дваіх мужчын, якія тануліна рацэ Лясная ў вёсцы Цюхінічы. Аднаго з грамадзян сведкі дасталі на бераг у непрытомным стане. Жонка пацярпелага правяла рэанімацыйныя мерапрыемствы. Мужчыну шпіталізавалі. Праз непрацяглы час на гэтым жа вадаёме супрацоўнікі МНС выратавалі яшчэ аднаго грамадзяніна, які тануў. Паводле папярэдняй інфармацыі, мужчына 1962 года нараджэння вырашыў пакупацца.

«Спачатку ён знаходзіўся на мелі, а затым стаў заплываць усё далей, — расказвае ратавальнік Дзмітрый Бурак. — Потым нырнуў, а калі вынырнуў, быў ужо з траўмай галавы. Пачаў захлынацца і клікаць на дапамогу. Мы дасталі яго з вады і перадалі медыкам».

Выратаваны мужчына быў шпіталізаваны. Месца здарэння не прызначана для купання.

— Не забывайцеся пра бяспеку і тады, калі вы адпраўляецеся на прагулку на лодцы, катары, катамаране або гідрацыкле, — рэкамендуе Анастасія Швайбовіч. — Падобнае падарожжа павінна адбывацца ў выратавальнай камізэльцы. Акрамя таго, нельга перавышаць устаноўленую колькасць людзей на борце, кіраваць плавальнымі сродкамі ў стане алкагольнага ап'янення, сядзець на бартах, пераходзіць з месца на месца і перасаджвацца на іншыя катары, лодкі. Забараняецца выходзіць на ваду на плаўсродках, не прыстасаваных для такіх мэт. Нярэдка трагедыяй заканчваецца і знаходжанне на вадзе ў надзіманых прадметах. Асабліва гэта небяспечна для тых, хто не ўмее плаваць.

Вераніка КАНЮТА.
Фота з адкрытых крыніц.

Адпраўляючыся на вадаём, памятайце аб правілах бяспекі:

— купацца можна толькі ў спецыяльна адведзеных месцах, на абсталяваных пляжах;

— не купайцеся ў стане алкагольнага ап'янення;

— не заплывайце за буйкі і іншыя агароджы, устаноўленыя ў месцах для купання;

— не дапускайце свавольства на вадзе і не палохайце іншых;

— не падавайце лжывых сігналаў бедства;

— не купайцеся ў вячэрні і начны час;

— не пакідайце дзяцей без нагляду.

Што рабіць, калі нехта тоне:

— паклічце на дапамогу іншых людзей або ратавальнікаў Таварыства выратавання на водах, калі яны ёсць побач;

— патэлефануйце па тэлефоне МНС 112 і выклічце хуткую дапамогу па тэлефоне 103;

— кіньце таму, хто тоне, выратавальны круг або доўгую вяроўку з вузлом на канцы (калі яны ёсць);

— калі ёсць лодка, падплывіце да чалавека і паспрабуйце дапамагчы;

— калі вы плаваеце добра і ўпэўненыя ў сваіх сілах, паспрабуйце дабрацца да чалавека самастойна: абхапіце яго ззаду за плечы і імкніцеся пазбегнуць спроб ухапіцца за вас, плывіце з ім назад;

— калі ж тапелец без прытомнасці, цягніце яго да берага, узяўшы рукой пад падбародак такім чынам, каб яго твар увесь час знаходзіўся над паверхняй вады, па магчымасці прыступіце да аказання першай дапамогі.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
2 жніўня 2023 г. № 27 (713)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Наталля КАЧАНАВА:

«НІВОДНАЕ ПЫТАННЕ ДА ЎЛАДЫ НЕ ЗАСТАЕЦЦА БЕЗ АДКАЗУ»

Старшыня Савета Рэспублікі расказала пра будучую электаральную кампанію і праблемныя пытанні ў грамадстве

Упачатку гэтага тыдня Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаная Прэзідэнта Беларусі па Мінску Наталля Качанава сустрэлася з калектывам ААТ «Мінскі домабудаўнічы камбінат». Гаворка на сустрэчы ішла найперш аб развіцці прадпрыемства і будаўнічай галіны ў цэлым. Работнікам паабяцалі, што сумесна з Мінгарвыканкамам будзе знойдзена рашэнне, якое пойдзе на карысць і сталіцы, і камбінату. Аднак не толькі такія пытанні цікавілі людзей.

Фота БелТА.

«Выбарчая кампанія пройдзе зладжана і спакойна»

Сустрэча праходзіла пасля нядаўняй нарады ў кіраўніка дзяржавы па пытаннях правядзення будучай выбарчай кампаніі. Наталля Качанава расказала, што апошнім часам Савет Рэспублікі працаваў над законапраектамі ў развіццё новай Канстытуцыі. Амаль 90 % з тых, што трэба было абнавіць, ужо адпрацавана; распрацаваны і новыя законы, у тым ліку аб Усебеларускім народным сходзе. Засталося сем законапраектаў, якія мяркуецца прыняць да канца бягучага года.

Спікер Савета Рэспублікі паведаміла калектыву прадпрыемства, што сенатары шмат працавалі над новым Кодэксам аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці. Работа над дакументам ішла няпроста: было выказана шмат заўваг, прапаноў, да дыскусій запрашалі практыкаў.

Таксама Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на будучай электаральнай кампаніі.

— Цяпер у нас пачынаецца вельмі важны перыяд у палітычным жыцці краіны, і ён будзе працяглым — 2024–2025 год. Пройдуць выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў, Палату прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі. 25 лютага 2024 года мы ўпершыню ў адпаведнасці з новай Канстытуцыяй правядзём адзіны дзень галасавання. Будзем выбіраць дэпутатаў усіх узроўняў. У Мінску гэта дэпутаты мясцовых Саветаў, іх будзе 60, плюс 20 дэпутатаў, што прадстаўляюць Мінск у Палаце прадстаўнікоў, а таксама восем сенатараў, якія будуць працаваць у Савеце Рэспублікі. А праз два месяцы, зноў жа ў адпаведнасці з новай Канстытуцыяй, мы павінны выбраць дэлегатаў на Усебеларускі народны сход. Яны ў такім складзе будуць працаваць на працягу пяці гадоў, гэтак жа, як і абраныя дэпутаты (тэрмін паўнамоцтваў цяперашніх складае чатыры гады), — растлумачыла Наталля Качанава.

Яна падкрэсліла, што электаральная кампанія будзе няпростым часам не толькі з прычыны навацый у Канстытуцыі.

— Выбары заўсёды з'яўляюцца тым вострым момантам, калі нашы апаненты пачынаюць будараваць грамадства. Дзесьці дарога незаасфальтаваная, дзесьці смецце не вывезена... Мы звяртаем на гэта ўвагу, не думайце, што сядзім у кабінетах. Ездзім па краіне, глядзім. І сітуацыя ўсюды розная. Прыязджаеш у адзін рэгіён, заходзіш у краму — прыгажосць. Заходзіш у іншую — ну так сабе. І тут уся справа ў кіраўніках, людзях, якія працуюць на месцах, бо ўся краіна жыве па адных і тых жа законах... Паверце, ніводнае пытанне да ўлады не застаецца без адказу. У нас сёлета за паўгода ў Савет Рэспублікі паступіла амаль чатыры тысячы зваротаў. Мы выязджаем у рэгіёны, сустракаемся з людзьмі, бачым, як яны жывуць... Мы разумеем, што сітуацыю цяпер будуць распальваць, але нельга паддавацца на тое, што скіравана на разбурэнне нашай краіны. Як кажа Прэзідэнт, самае галоўнае — захаваць суверэнітэт і незалежнасць Беларусі. І мы дзейнічаем, сыходзячы з інтарэсаў нашай краіны, — адзначыла Наталля Качанава.

Пры гэтым яна выказала ўпэўненасць, што нягледзячы на спробы расхістаць сітуацыю, электаральная кампанія пройдзе спакойна і зладжана.

— Сур'ёзная работа чакае мясцовыя органы ўлады, ды і ўсіх людзей, якія будуць удзельнічаць у гэтым важным для нашай краіны палітычным мерапрыемстве. Усё павінна прайсці зладжана, спакойна, упэўнена, — так, як заўсёды мы праводзілі электаральныя кампаніі. Мы разумеем, што будзе ўздзеянне знешніх апанентаў, якія сёння імкнуцца дэстабілізаваць абстаноўку ў нашай краіне, але ў іх не атрымаецца. Я бачу, як людзі сёння ставяцца да ўлады, да тых рашэнняў, якія прымаюцца, і ўпэўнена, што мы правядзём гэтую выбарчую кампанію на высокім узроўні, як заўсёды было ўласціва нашаму беларускаму народу, нягледзячы на знешнія фактары і пагрозы, — сказала Наталля Качанава.

«Такія краіны, як наша, — косць у горле для многіх»

Спікер Савета Рэспублікі падкрэсліла таксама важнасць супрацоўніцтва з краінамі-партнёрамі.

— Мы разумеем, што Расія — наш стратэгічны партнёр. У нас і сумесныя прадпрыемствы, і пастаўкі нашай прадукцыі на экспарт, за кошт чаго ў тым ліку жыве наша краіна. Расія — гэта вялізны рынак. Як і Кітай, дружалюбная нам краіна, з якой у нас выдатныя адносіны. Варта працаваць і з Афрыканскім кантынентам, дзе магчымая пастаўка нашай прадукцыі, стварэнне новых вытворчасцяў.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Экспертны савет, прыёмы грамадзян, справы моладзі

Насычаны тыдзень сенатараў

Пад кіраўніцтвам **Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ** адбылося чарговае пасяджэнне экспертнага савета. Экспертамі разгледжаны пытанні карэкціроўкі заканадаўства аб парадку праходжання ваеннай службы па чатырох напрамках: удасканаленне парадку звальнення ваеннаслужачых у адстаўку; канкрэтызацыя пытанняў, звязаных з кампенсацыяй грамадзянамі расходаў за навучанне ў ваенных навучальных установах; удакладненне парадку давання асноўнага водпуску ваеннаслужачаму, які праходзіць службу за межамі РБ, і ваеннаслужачаму, якому падчас асноўнага водпуску выдадзены дакумент аб часовай непрацаздольнасці; змяненне парадку агляду ваеннаслужачых ваенна-ўрачэбнымі камісіямі.

На пасяджэнні экспертнага савета таксама разгледжана пытанне аб змяненні заканадаўства, якое датычыцца парадку і ўмоў прысуджэння спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп». Праектам, у прыватнасці, прадугледжваецца павелічэнне памеру спецыяльнай прэміі, рэгламентацыя парадку і тэрмінаў падрыхтоўкі і разгляду дакументаў на суісканне спецыяльнай прэміі. Экспертамі прапануецца пашырыць пералік суіскальнікаў прэміі за кошт уключэння ў яго калектываў і арганізацый фізічнай культуры і спорту па аналогіі з прэміяй «За духоўнае адраджэнне».

***

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ правёў асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб. Пытанні, з якімі звярнуліся грамадзяне, датычыліся абскарджання судовых пастаноў, нязгоды з дзеяннямі службовых асоб праваахоўных і іншых дзяржаўных органаў, рашэннямі мясцовых органаў улады і іншага.

Таксама прамую тэлефонную лінію і асабісты прыём грамадзян правяла ў Пінску **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, загадчыца натарыяльнай канторы горада Пінска Ірына САЧКОЎСКАЯ.** Пытанні, якія паступілі, былі дастаткова разнапланавыя: капітальны рамонт шматкватэрных жылых дамоў і сацыяльных кватэр, знос жылых дамоў і выдзяленне жылля ўзамен знесенага, пытанні прававога характару, якія датычацца маёмасных правоў грамадзян, судовай абароны.

***

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ правёў рабочую сустрэчу са старшынёй Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Мікітам Рачыловіскім. У кантэксце маючага адбыцца візіту парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліку Беларусь абмеркаваны пытанні падрыхтоўкі да падпісання мемарандума аб супрацоўніцтве паміж маладзёжнымі парламенцкімі структурамі Беларусі і Узбекістана, магчымай распрацоўкі дарожнай карты мерапрыемстваў па рэалізацыі названага мемарандума. Разгледжаны магчымыя напрамкі далейшага ўзаемадзеяння маладзёжных парламентарыяў, у тым ліку абмен вопытам у галіне павышэння прававсвядомасці і прававой адукаванасці моладзі, правядзенне дыялогаў па пытаннях забеспячэння сацыяльна-прававой абароны моладзі. У рамках падрыхтоўкі да маючага адбыцца ў Мінску Беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму абмеркаваны пытанні ўдзелу прадстаўнікоў Маладзёжнага савета ў мерапрыемствах форуму: пасяджэннях тэматычных секцый і пленарным пасяджэнні.

Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.

«НІВОДНАЕ ПЫТАННЕ ДА ЎЛАДЫ НЕ ЗАСТАЕЦЦА БЕЗ АДКАЗУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

У якасці прыкладу работы па аднаўленні вытворчасці Старшыня Савета Рэспублікі прывяла «МотаВелаЗавод».

— Сітуацыя была такая, што толькі зборка-зборка-зборка. А Прэзідэнт сказаў: лакалізацыя, гэта значыць выпуск камплектуючых у нас. Многае ўжо зроблена, вось цяпер, напрыклад, стаіць пытанне выпуску рухавіка на матацыкл. Нядаўна завод паставіў невялікую партыю веласіпедаў у Кенію. Сёння на пустых плошчах прадпрыемства ствараецца тэхнапарк, 128 рэзідэнтаў ужо закантрактавана і прыйдуць працаваць. Цяпер глядзім завод «Гарызонт»: таксама пустыя плошчы, якія трэба заняць. Бо гэта грошы ў бюджэт, а значыць, будзе магчымасць праводзіць рэканструкцыю паліклінік і бальніц, адкрываць новыя школы і дзіцячыя садкі, рабіць усё, каб Мінск быў прыгожым і дагледжаным.

Наталля Качанава нагадала, што ўсе рашэнні ў краіне прымаюцца на карысць людзей.

— Такія краіны, як наша, — косць у горле для многіх, бо мы жывём сваімі мазгамі, традыцыямі. Нічога ж не робіцца супраць народа. Вось я прадстаўніца ўлады, і мне казалі калісьці: вы раздзяляеце народ і ўладу. А я адказвала: а чым я не народ? У мяне простая сям'я, рабочых прафесій бацькі і брат, я такі ж просты народ, толькі працую цяпер на іншай пасадзе... І ўсім нам важна разумець, што трэба захаваць краіну. Не будзе нам шчасця ў іншай краіне. Хто хоча з'ехаць — калі ласка, ніхто не няволіць, пажывіце за мяжой. А тут мы жывём вось так, пабудаваўшы краіну за такі непрацяглы ў гісторыі тэрмін. Сёння ўсе госці кажуць: выдатная краіна. Вучыцеся, працуйце, стварайце сем'і, нараджайце дзяцей — хто хоча рэалізаваць сябе ў краіне, калі ласка, усе магчымасці для гэтага ёсць.

Яна дадала, што сацыяльная сфера — прыярытэт у нашай дзяржаве. І сем'і, і людзі ў цяжкім становішчы заўсёды могуць разлічваць на падтрымку. Але пры гэтым важна, каб кожны ўсведамляў, што яго дабрабыт — зона яго ўласнай адказнасці.

— Нягледзячы на санкцыі, нашы прадпрыемствы працуюць і павінны працаваць. Бо гэта фарміраванне бюджэтаў, што дапамагае нам выплачваць пенсіі, дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, вырашаць пытанні ў ахове здароўя, набываць сучаснае медыцынскае абсталяванне і выплачваць заработную плату ўрачам, настаўнікам, забяспечваць бяспеку нашай краіны і спакой на нашых вуліцах. А вось прымусіць некаторых людзей працаваць — сёння праблема. Вядома, дзяржава прымае рашэнні па падтрымцы сем'яў, але чалавек павінен разумець, што ў яго ёсць адказнасць за яго жыццё, за сям'ю і дзяцей. Паглядзіце, у нас амаль 20 тысяч сірот у краіне. І гэта не біялагічныя, а сацыяльныя сіроты. 19 тысяч таў і мам пазбаўлена бацькоўскіх правоў.

«Мы не збіраемся ні з кім ваяваць»

Наталля Качанава падкрэсліла, што Беларусь не збіраецца ні з кім ваяваць і не дапусціць вайны.

— Вы бачыце, якую колькасць узбраенняў сцягнулі да нашых заходніх граніц. У 2020 годзе я, калі бачыла тэндэнцыі, што адбываюцца ў нашай краіне, — каляровыя рэвалюцыі, метадычкі, — думала, што гэта вельмі падобна да сітуацыі перад пачаткам Другой сусветнай вайны. Вось сёння адбываецца нешта падобнае. Вы бачыце, што ідзе гонка ўзбраенняў і якія сродкі на тое выдаткоўваюцца. Чамусьці яны вырашылі, што хтосьці будзе на некага нападаць. Прэзідэнт шмат разоў казаў: мы — міралюбівая краіна. Наша самая галоўная задача — жыць у міры і згодзе з усімі краінамі, якія па-добраму ставяцца да нашай дзяржавы. Мы ні на чые землі не прэтэндуем, не збіраемся ні з кім ваяваць, гэта супраць нашых правілаў. Беларусь перажыла не адну трагедыю ў сваёй гісторыі. Наш народ напакутаваўся, нам таго не трэба. І мы павінны зрабіць усё, каб на нашай зямлі не было вайны. Гэта наша задача — не дапусціць яе. Як кажа Прэзідэнт, ён зробіць усё, каб не дапусціць вайны.

Закранула Наталля Качанава і іншыя праблемныя пытанні ў грамадстве. Адна з іх — наркатычная пагроза, што актуальна для ўсіх бацькоў, якія выхоўваюць падлеткаў.

— Гэта бяда, бо сёння імкнуцца ўцягваць моладзь, і трапляюцца неразумныя дзеці, якія на нейкім этапе хочуць падзарабіць, а тэрміны атрымліваюць вялікія — мінімум дзесяць гадоў за распаўсюджванне. Вось нядаўна ў Мінску затрымалі сур'ёзных наркадзялкоў. Да іх прыехалі забіраць тавар з рэгіёнаў. І хто прыехаў? 16-гадовы хлопец. І потым звяртаюцца да нас бацькі: дапамажыце, навошта іх ізаляваць... А што рабіць? Так хоць жыццё ім захаваеш, мы ж бачым, што адбываецца з перадазіроўкамі. Сур'ёзнае сёння пытанне і па педафіліі. Мы разглядаем меры, як тут узмацніць заканадаўства.

Звярнулася Старшыня Савета Рэспублікі і да тэмы дэмаграфічнай бяспекі.

— Гэта традыцыйныя нашы каштоўнасці — сям'я, выхаванне дзяцей. Але вось сказала я ў шостай бальніцы, калі віншавала мам, каб нараджалі нам больш беларусаў. І крытыцы падверглася: «Качанава прымушае нараджаць». Ды нікога я не прымушаю. Аднак калі ты пражыў жыццё, разумееш, што самае галоўнае — сям'я, куды ты заўсёды прыйдзеш, дзе твае дзеці і ўнукі, і ты разумееш, што ў цябе ёсць будучыня, твой працяг. Толькі важна ўсведамляць гэта і ў маладосці, — рэзюмавала Наталля Качанава.

Алена КРАВЕЦ.

СЕНАТАР У РЭГІЁНЕ

НЕВЯДОМЫЯ СТАРОНКІ КАЛОЖЫ

КАЛЯ трох тысяч экзэмпляраў унікальнага выдання перадаў храму член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання ад Гродзенскай вобласці Валянцін БАЙКО.

Гаворка ідзе пра кнігу гродзенскага гісторыка Мікалая Малішэўскага «10 вякоў гісторыі Каложы». Асаблівасці гэтай навуковай работы ў тым, што сюды ўвайшлі архіўныя дакументы XVI—XVIII стагоддзяў, якія дагэтуль былі невядомыя. Новае выданне стане яшчэ адным важным элементам у падрыхтоўцы дасье для ўключэння знакамітага помніка XII стагоддзя ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Кніга расказвае аб гісторыі і ўнікальных асаблівасцях найстаражытнейшага храма Беларусі, яго змена на працягу вякоў. «Сёння вельмі важна і неабходна, каб людзі памяталі сваю гісторыю, важна захаваць нашы святыні для будучых пакаленняў», — падкрэсліў Валянцін Байко.

Як расказаў **настаяцель Каложскай царквы протаіерэй Аляксандр БАЛОННІКАЎ,** да гэтага часу не існавала такога поўнага даследавання гісторыі знакамітага храма. У выданні гродзенскага гісторыка Мікалая Малішэўскага прадстаўлены не толькі гістарычныя асаблівасці развіцця святыні, спробы захавання яе ў розныя эпохі, але і архітэктурныя адметнасці з сучаснага пункту гледжання. Кніга таксама дапоўненая інфармацыяй аб самым маштабным рамонце, які адбыўся ў 2017—2018 гадах.

— Сродкі на рамонт былі выдзелены фондам Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва, курыраваў работы тагачасны кіраўнік рэгіёна Уладзімір Краўцоў. Менавіта пры падтрымцы абласных улад быў здзейснены гэты складаны і сучасны праект, які дазволіў захаваць сусветна вядомы помнік і не нашкодзіць яго аўтэнтычнасці, — адзначыў Аляксандр Балоннікаў.

На думку настаяцеля, вельмі важна, што ў кнізе аддаецца значная ўвага вяртанню святынь. Пасля рамонту былі знойдзены іконы, якія належалі храму, — дзве былі напісаны ў 1897 годзе і галоўная святыня — ікона Каложскай Божай Маці — была выкуплена на аўкцыёне ў Германіі.

Таксама новае выданне важнае і ў плане падрыхтоўкі дасье на ўключэнне Каложскай царквы ў спіс Сусветнай гісторыка-культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

— Гэта даволі працяглы і складаны працэс, — заўважыў святар. — Каложа ўжо прызнана сусветным помнікам архітэктуры. І гэта бясспрэчны факт. Але для таго, каб трапіць у спіс сусветнай спадчыны, трэба падрыхтаваць дакументы, якія адпавядаюць усім міжнародным патрабаванням. Сіламі прыхода, напрыклад, праведзены тры міжнародныя канферэнцыі, і гэта вялікі задзел. Новая кніга таксама з'яўляецца важным элементам дасье. Падчас работы над ёй аўтарам былі адкрытыя архівы Каложскай царквы XVI — XVIII стагоддзяў, якія былі дагэтуль невядомыя. Асобная манаграфія цяпер рыхтуецца да выдання.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Фота t.me/sovrep

У ФАРМАЦЕ РАБОЧАЙ ПАЕЗДКІ

«САЦЫЯЛКА» ВЫРАШАЕ ДЭМАГРАФІЮ

Валерый Бельскі ў Брагінскім раёне гаварыў з кіраўніцтвам і медыкамі аб гэтым і не толькі

НЯДАЎНА кіраўнік дзяржавы падпісаў распараджэнне «Аб павышэнні эфектыўнасці работы сістэмы аховы здароўя». Па выніках нарады, якая адбылася 23 мая 2023 года, Прэзідэнтам дадзены канкрэтныя даручэнні аб навядзенні парадку ва ўстановах аховы здароўя ўсіх узроўняў, стварэнні ўмоў для аказання якаснай медыцынскай дапамогі насельніцтву. Пры гэтым асаблівая ўвага павінна аддавацца медыцыне ў глыбінцы. Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ падчас рабочай паездкі ў гарадскі пасёлак Брагін узяў удзел у пасяджэнні райвыканкама, а таксама азнаёміўся з работай Брагінскай ЦРБ, асабіста пагутарыў з медыцынскім персаналам.

Унікальны ў сваім родзе

Па выніках паўгоддзя ў раёне, дарэчы, адным з найбольш пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, выкананы паказчык па тэмпе росту сярэднямесячнай зарплаты. Ён склаў 117 працэнтаў. Прыцягнута 25,7 мільёна беларускіх рублёў інвестыцый у асноўны капітал, або 108,3 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года.

Ёсць дзве прапановы па стварэнні невялікіх аграпрадпрыемстваў. Напрыклад, цікавы праект па вырошчванні буякоў. Па словах **намесніка старшыні райвыканкама Пятра РАМАНЮКА,** падтрымку ў яго рэалізацыі гатовы аказаць Інстытут лесу. У прыватнасці, гаворка ідзе аб закупцы саджанцаў. Другі праект звязаны з вырошчваннем журавін і пасадкай саду.

Да канца года плануецца ўвесці 3,8 тысячы квадратных метраў жылля, уключаючы 40-кватэрны электрадом. З дзяржпадтрымкай будуецца шэсць аднакватэрных жылых дамоў.

Пакупнікоў раёна абслугоўвае 155 гандлёвых аб'ектаў на 6,5 тысячы квадратных метраў. Паказчык па рознічным тавараабароце гандлю за шэсць месяцаў склаў 95,4 працэнта пры заданні 92 працэнты.

За паўгода ў раёне зарэгістравана 11 індывідуальных прадпрымальнікаў. У ліку прыярытэтных напрамкаў — вытворчасць тавараў прадуктовай і прамысловай групы, сельскагаспадарчыя праекты, аказанне камунальна-бытавых паслуг, арганізацыя вольнага часу і адпачынку для дзяцей і моладзі, развіццё турыстычнай інфраструктуры.

За студзень — чэрвень у раёне нарадзіліся 62 дзіцяці. Паказчык нараджальнасці склаў 10,5 на тысячу насельніцтва. І гэта найлепшы паказчык па Гомельскай вобласці.

Ацэньваючы развіццё розных сфер раёна, Валерый Бельскі акцэнтаваў, што лічбы, паказчыкі — толькі індыкатары дынамікі.

— Важней за ўсё — паважаць людзей, ствараць для іх камфортныя ўмовы. Брагінскі раён — унікальны ў сваім родзе, многае зроблена для яго развіцця, у тым ліку за кошт сродкаў, што накіроўваюцца на пераадоленне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Наша краіна — у нашых руках, і ад кожнага з нас залежыць яе развіццё, — адзначыў ён.

Віцэ-спікер нагадаў, што ўжо налета пройдзе Адзіны дзень галасавання, і пазначыў асноўныя моманты выбарчай кампаніі, якая ўпершыню адбудзецца ў новым фармаце.

Валерый Бельскі таксама абазначыў напрамкі, па якіх варта ўзмацніць пазіцыі. Гэта АПК з акцэнтам на насенны фонд, строгае прытрымліванне тэхналогій у жывёлагадоўлі, актывізацыя вытворчых працэсаў і перагавораў з патэнцыяльнымі экспарцёрамі для выхаду на новыя рынкі, а таксама забеспячэнне жыллём. Падтрымка на абласным і рэспубліканскім узроўнях заўсёды гарантаваная, падкрэсліў ён.

Віцэ-спікер звярнуў увагу, што ў плане работы са зваротамі грамадзян пытанняў да раёна няма.

— У цэлым, для вырашэння праблем грамадзян неабходна праявіць волю, жаданне і рашучасць, дзейнічаць з пазіцыі справядлівасці і чалавечнасці, — падкрэсліў ён.

Акрамя разгляду зваротаў, якія паступілі непасрэдна ў райвыканкам, кіраўніцтва раёна праводзіць таксама прамыя тэлефонныя лініі, выязныя прыёмы. У абсалютнай большасці звароты датычацца жыллёва-камунальнай і дарожнай гаспадаркі, добраўпарадкавання тэрыторый і жыллёвага фонду.

Старшыня Брагінскага райвыканкама Сяргей КАРПЕНКА адзначыў, што заўсёды адкрыты для размоў з насельніцтвам, выязджае ва ўсе населеныя пункты. Для інфармавання жыхароў раёна створаны афіцыйныя Telegram-каналы, спецыяльныя рубрыкі ў раённай газеце.

Прафесія ад Бога

Урачы павінны быць саюзнікамі дзяржавы ва ўмацаванні дэмаграфічнай сітуацыі, інстытута сям'і, павышэнні нараджальнасці. З такім пасылам звярнуўся Валерый Бельскі да калектыву Брагінскай цэнтральнай бальніцы. Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі азнаёміўся таксама з умовамі працы персаналу, з абсталяваннем ЦРБ. На сустрэчы з яе калектывам была ўзнятая тэма дэмаграфічнай сітуацыі. На думку Валерыя Бельскага, роля ўрачоў у гэтым плане — асабліва.

— Слова ўрача — прадстаўніка прафесіі ад Бога, яго падтрымка шмат значыць для пацыента. Спецыяліст параіць, як падрыхтавацца да папаўнення ў сям'і, ён першы паведамляе навіну аб цяжарнасці будучым бацькам. У тым ліку ў сілах дактароў — прафілактычная работа, папярэджанне рызык і паталогій, звязаных з дзетараджэннем. Вядома, у нашай краіне многае робіцца для ўмацавання сямейнай палітыкі, і ў першую чаргу гэта сацыяльныя гарантыі, але і ахова здароўя павінна выступаць саюзнікам дзяржавы ва ўмацаванні дэмаграфічнай сітуацыі.

У калектыве падтрымалі пазіцыю віцэ-спікера верхняй палаты парламента і прывялі прыклад сям'і маладога ўрача-хірурга. Арцём Аляксеенка прыехаў у раённую бальніцу па размеркаванні разам з жонкай і двума дзецьмі. Сям'і выдзелілі арэнднае жыллё. Уладкаваўшыся на новым месцы, рашыліся на трэцяе дзіця. Цяпер маладая мама ў дэкрэце, а бацька клапоціцца пра дабрабыт сям'і. Усяго ў раёне каля 260 шматдзетных сем'яў.

Больш падрабязна аб рабоце галоўнай установы аховы здароўя Брагінскага раёна расказаў журналістам **галоўны ўрач Брагінскай ЦРБ Ігар КІРЭНЯ.**

— Рамонт паліклінікі быў зроблены ў 2010 годзе. У жніўні бягучага года плануецца ўвядзенне ў эксплуатацыю міжраённага кабінета рэнтгенаўскай камп'ютарнай тамаграфіі. Лагістычна гэта будзе больш зручна для насельніцтва, таму што сто кіламетраў да Гомеля — зусім не блізка. Мяркуецца, што ў кабінеце будуць абслугоўвацца жыхары Лоева, Брагіна і Хойнікаў.

З новага: урачы цяпер працуюць у дзве змены, павялічылі ў разы колькасць выездаў — ідзём да насельніцтва. Мы праводзім суцэльныя падворныя абходы, нашы работнікі арыентаваныя на тое, каб максімальна выявіць рызыкі, паталагічныя станы на ранніх стадыях, — кажа галоўны ўрач.

> Да канца года плануецца ўвесці 3,8 тысячы квадратных метраў жылля, уключаючы 40-кватэрны электрадом. З дзяржпадтрымкай будуецца шэсць аднакватэрных жылых дамоў.

Усяго ў Брагінскім раёне 15 арганізацый аховы здароўя, з іх — 12 ФАПаў і тры амбулаторыі.

— У нас вялікая ўдзельная вага сельскіх жыхароў пажылога ўзросту, таму мы павінны так выбудоўваць сваю работу, каб яны адчулі клопат з боку сістэмы аховы здароўя. У студзені бягучага года мы першыя ў Гомельскай вобласці прайшлі акрэдытацыю па ўсіх профілях, — з гонарам канстатуе Ігар Кірэня.

Раён, дзе жыццё працягваецца

Брагін заўсёды меў высокі ўзровень нараджальнасці. У Гомельскай вобласці ён ужо каторы раз займае першае месца. Гэта, мяркуе галоўны ўрач, звязана не толькі з аховай здароўя, але і з сацыяльнымі прэферэнцыямі: дапамогі ў два разы больш, чым у чыстых рэгіёнах, выдзяленне жылля, аплата лістка непрацаздольнасці раней, чым у чыстых рэгіёнах, сама палітыка раёна ў адносінах да шматдзетных сем'яў — на высокім узроўні.

Па словах Ігара Кірэні, для ўрачоў створаны добрыя ўмовы працы:

— Калектыў у нас малады, творчы. Налічваецца 163 сярэднія медыцынскія работнікі і 43 ўрачы. Аднак праблемы з недахопам кадраў ёсць заўсёды і ва ўсіх. Падрыхтоўка медыцынскіх кадраў — вельмі працяглы, дарагі і працаёмкі працэс. Натуральна, у малых раёнах не ўсе хочуць заставацца. Са свайго боку, мы прымаем усе меры: стабільна плацім зарплату, выканкам выдзяляе жыллё, можна сказаць, на руках іх носім, але, на жаль, гэта жыццё, і трэба прызнаць, што ратацыя кадраў — нармальная з'ява. Галоўнае — быць да таго гатовымі, плануваць адток, прыбыццё, навучанне кадраў, каб не было форс-мажорных момантаў. Яны, вядома, бываюць, але трэба старацца іх мінімізаваць. Калі да нас прыехаў урач і сумленна, нармальна адпрацаваў пяць гадоў, то гэта ўжо выдатна...

Валерый Бельскі ў размове з журналістамі падзяліўся ўражаннямі ад сваёй рабочай паездкі:

— На пасяджэнні ў Брагінскім райвыканкаме мы мелі магчымасць абмеркаваць дасягнутыя вынікі. Яны, у цэлым, нядрэнныя, аднак існуюць асобныя праблемы. Апошнія абумоўленыя, у першую чаргу, санкцыйным ціскам, які адбіўся на дзейнасці канкрэтных дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў. Цяпер праходзіць адаптацыйны перыяд, які прыводзіць да станоўчай дынамікі экспарту, таму што прадпрыемствы працавалі пераважна ў дадзеным кірунку. Цяпер ужо фактычна новыя рынкі вызначаны і адпрацоўваецца лагістыка дастаўкі прадукцыі. Думаю, усё будзе нармальна. Таксама былі дэталёва разгледжаны вынікі работы ў сельскай гаспадарцы. Спыняліся на асобных праблемах. І старшынёй раённага выканаўчага камітэта, і членамі выканкама, і кіраўнікамі прадпрыемстваў былі разгледжаны стратэгіі, як дастойна падысці да стойлавага перыяду, зрабіць запас кармоў, своечасова ўбраць збожжавыя, выканаць усе тыя задачы, на якіх спыняўся кіраўнік дзяржавы.

Ну і, вядома ж, важны момант дзейнасці Савета Рэспублікі, прырытэтны для нашай краіны — работа са зваротамі грамадзян. Былі даведзены ўстаноўкі Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай у такім напрамку. Найважнейшай задачай апарату рознага ўзроўню органаў дзяржаўнага кіравання з'яўляецца інфармацыйная работа. Цяпер праводзіцца месячнік, дні інфармавання адносна дэмаграфічнай сітуацыі. Сустрэча з калектывам галоўнай медыцынскай установы Брагінскага раёна прайшла паспяхова. Мне падалося, што наша сяброўская гутарка была цікавай. Спадзяюся, вынік ад такой размовы будзе станоўчы. Вельмі важна, што людзі ставяцца да сваёй прафесіі адказна, — падкрэсліў Валерый Бельскі. Толькі так і можа паступаць сапраўдны ўрач.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.

СПРАВЫ ЖЫЦЦЁВЫЯ

КОЖНЫ ДЗЕНЬ РАСПІСАНЫ ПА ХВІЛІНАХ,

або Калі адпачывае старшыня сельсавета

Смілавіцкі сельсавет — не толькі самы буйны ў Чэрвеньскім раёне, але і адзін з найбуйнейшых у Мінскай вобласці. Толькі ў гарадскім пасёлку Смілавічы пражывае больш як сем тысяч чалавек. І з кожным годам колькасць насельніцтва павялічваецца. Дэмаграфічнай сітуацыі спрыяе зручнае геаграфічнае становішча, блізкасць да Мінска.

А ўзначальвае сельсавет вельмі неараўнадушная жанчына **Ірына МАРЦІНОВІЧ.** Чым толькі не даводзіцца займацца старшыні сельвыканкама. І сем'ямі, у якіх дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, і асацыяльнымі асобамі, што злоўжываюць спіртным, і пошукам работы для тых, хто не занадта імкнецца працаваць, і добраўпарадкаваннем тэрыторый, навядзеннем парадку на зямлі. Спіс спраў можна працягваць бясконца. Дзень у Ірыны Пятроўны распісаны літаральна па хвілінах.

— Мой рабочы дзень пачынаецца з вечара. Я павінна запланаваць, хто што будзе рабіць заўтра. Сказаць, што я на рабоце з сямі-васьмі раніцы — будзе недакладна, — прызнаецца Ірына Марцінавіч. — А раніцай кантралюю, каб не саравалася запланаванае. Напрыклад, сёння работнікі аграрнага каледжа і прадпрыемства меліярацыйных сістэм расчышчаюць могілкі ад зарасніку. Папярэдне на сустрэчы з кіраўнікамі абгаварылі фронт работ, падлічылі, колькі трэба людзей, тэхнікі, кос. Запланаваны і суботнік па добраўпарадкаванні, зноў збіраемся разам і распрацоўваем планы. Напрыклад, адна арганізацыя высаджвае кветкі, іншая дапамагае мне па добраўпарадкаванні грамадскіх тэрыторый, школа праводзіць работу для ўладкавання варкаўт-пляцоўкі. Ёсць таксама замацаваныя за арганізацыямі тэрыторыі. Яны павінны быць пастаянна прыбраныя: летам — ад травы, смецця, зімой — ад снегу.

— І калі вы адпачываеце пры такім рабочым рытме? — цікаўлюся ў сваёй суразмоўніцы.

— Мне могуць патэлефанаваць і вечарам, і зусім рана. У некага няма вады, да кагосьці ў агарод забегла суседская хатняя жывёла, нашкодзіла. Я адказваю на ўсе званкі, не звяртаючы ўвагі на тое, знаёмы ці незнаёмы нумар.

Ірына Пятроўна сцвярджае, што прывыкла да такога ладу жыцця — работа ёсць работа, тым больш падтрымлівае сям'я. Муж, дочкі Алена і Юліяна, два ўнукі. І калі дадому прыходзяць наведвальнікі, члены сям'і сыходзяць, каб маці магла спакойна пагутарыць з грамадзянамі, выслухаць, па меры магчымасці дапамагчы. А каб вырашаць шматлікія пытанні, што хвалююць мясцовых жыхароў, трэба заўсёды быць у тэме, мець юрыдычныя веды. Таму Ірына Марціновіч займаецца самаадукацыяй, інфармацыю чэрпае з інтэрнэту, чытае розныя пастановы, дакументы, законы.

— Напрыклад, у апошні час шмат зваротаў па пытаннях добраўпарадкавання тэрыторый, што знаходзяцца за межамі зямельных участкаў. Адны хочуць пасадзіць дрэвы, паставіць лаўкі, вылажыць пад'езд да дома пліткай або заасфальтаваць. І ва ўсім трэба быць кампетэнтнай, растлумачыць, як тое зрабіць, куды звярнуцца, пракансультаваць, — адзначае Ірына Марціновіч.

— Накольк я зразумела, у Смілавічах з кожным годам паляпшаецца дэмаграфічная сітуацыя, нараджаюцца дзеці. Хапае дзіцячых дашкольных устаноў? — задала ёй пытанне.

— Чакаем, што сёлета пачнецца будаўніцтва новага дзіцячага садка. У нас два садкі, але яны перапоўненыя, таму што пасёлак расце, развіваецца. Мы актыўна будуемся. 40-кватэрны дом уведзены ў эксплуатацыю сёлета, тры ў стадыі будаўніцтва. Жыллё ўзводзяць у асноўным маладыя сем'і, якія нараджаюць дзяцей, — значыць, будзе жыць пасёлак, будзе работа, прыліў маладой рабочай сілы. А для таго каб моладзь будавалася, ствараем для іх інфраструктуру — дарогі, водаправоды, праводзім добраўпарадкаванне.

